СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 5.18, 21.12, 15.54;
Віцебск — 5.02, 21.08, 16.06;
Магілёў — 5.07, 21.01, 15.54;
Гомель — 5.13, 20.51, 15.38;
Гродна — 5.36, 21.25, 15.49;
Брэст — 5.42, 21.20, 15.38.

МЕСЯЦ:
Маладзік 29 ліпеня.

ІМАНІНЫ:
Марыны, Маргарыты, Лазара, Леаніда;
Юліты, Людмілы.

ЗВЯЗДА

30 ЛІПЕНЯ 1992 г.
чацвер, № 150 (21928)

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1 рубель

РОЗГАЛАС

УРАДЖАЙ-92

СЯЛЯНЕ ПАТРАБУЮЦЬ ПАРЫТЭТНЫХ ЦЭН НА ЗБОЖЖА

На сумесным пасяджэнні прэзідыумаў савета Мінскай абласной арганізацыі Саюза аграрнікаў Беларусі і савета калгаснікаў вобласці з удзелам старшынь раённых арганізацый разгледжана пытанне продажу збожжа новага ўраджаю ў дзяржаўныя рэсурсы. На ім адзначалася, што ва ўрадавай пастанове «Аб надзвычайных мерах па фарміраванню дзяржаўных рэсурсаў збожжа ў 1992 годзе» істотна ўшчамляюцца інтарэсы сялянства. Адпаведна на пасяджэнні прыняты зварот да кіраўнікоў калгасаў, дзяржгасаў, фермераў, калгаснікаў і рабочых саўгасаў. Працаўнікі вёскі закліканы ўстрымацца ад продажу збожжа дзяржаве да таго часу, пакуль Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь не адменіць гэтую дыскрымінацыйную пастанову. Прапанавана трымацца да таго часу, пакуль закупачныя цэны на зерне азімага жыта будуць не ніжэй як 15 тысяч рублёў за тону, і толькі потым разгарнуць актыўны продаж збожжа ў адпаведнасці з дагаворамі кантрактацыі.

Варта дадаць, у калгасах і саўгасах Мінскай вобласці адбываюцца сходы ўпаўнаважаных працоўных калектываў. На сходах падтрымліваецца патрабаванне да Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь устанавіць парытэтную з таварамі прамысловых галін цану на збожжа, якая акупляла б выдаткі гаспадарак на яго вытворчасць.

Іван АБАБУРКА.

БЕНЗІНАВЫ «ГОЛАД» ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Кажуць, голад — не цётка. Хлебнага голаду, дзякуй Богу, мы пакуль што не ведаем, а вось бензінавы — ужо даўно. Таму зусім нядаўна перайшлі на лімітныя карткі спажыўца нафтапрадуктаў, якія здавалася б, павінны былі астудзіць пыл аўтааматараў і ліквідаваць чэргі на бензакалонках.

Але дзе там! Як быў «хвост» на паўкіламетра, так і застаўся. Па-ранейшаму прыходзіцца чакаць свае 30 ці 80 літраў па 2—3 гадзіны, і ўсё роўна не хапае паліва, з-за якога часам узнікаюць сваркі, нават бойкі паміж вадзіцелямі.

АДЗІН У ПОЛІ

Паводле ацэначных даных СААЗ на 30 чэрвеня 1992 года, у свеце звыш 500 тысяч хворых СНІДам, 10 млн. віч-інфіцыраваных зарэгістраваны ў 170 краінах. Беларусь займае трэцяе месца сярод краін СНД па колькасці ВІЧ-інфіцыраваных: амаль сто заражаных, дзве смерці, упершыню сярод рэспублік былога Саюза інфіцыраваныя выяўлены сярод наркаманаў.

Але атрымліваецца так, што ў нас пытанні СНІДу па-ранейшаму ў кампетэнцыі толькі Міністэрства аховы здароўя і Цэнтра па прафілактыцы СНІДу. Але адзін у полі — не воін.

Аб'яднанне намаганняў і рэсурсаў усіх міністэрстваў і ведамстваў, установ і грамадскіх арганізацый — вось што можа прывесці да поспеху ў барацьбе са СНІДам.

ПАЖАРНЫ З ВОЗУ—АГНЮ ЛЯГЧЭЙ...

Сёння дажджу ў Беларусі чакаюць усе — ад дачнікаў да хлебаробаў. Але, дарэчы, найбольш падстаў маліцца на выратавальныя кроплі з неба — у пажарных.

Паводле даных на 29 ліпеня, на тэрыторыі рэспублікі зафіксаваны 195 буйных пажараў у лясах, на тарфяніках, асобныя з якіх ахопліваюць 300 і больш гектараў. Упершыню за апошнія гады ні адна з абласцей Беларусі не стала выключэннем з гэтай сумнай статыстыкі — лясы і тарфянікі гараць практычна ў кожным раёне.

Віталь ЦЫГАНКОЎ.
БелаПАН.

У САВЕЦЕ МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Адбылося чарговае пасяджэнне Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. У насычаным парадку дня асноўнае месца заняло пытанне аб ходзе выканання рашэнняў урада аб вытворчасці кармоў і фарміраванні дзяржаўных рэсурсаў збожжа ў 1992 годзе. З дакладчыкам, міністр сельскай гаспадаркі і прадуктаў харчавання Ф. Мірачыцкі, і кіраўнікі абласцей рэспублікі, якія затым выступілі, падкрэслівалі выключную складанасць сітуацыі, што ўзнікла ў сферы аграрнай вытворчасці з-за працяглай засухі. Урон ураджаю нанесены практычна паўсюдна ў Віцебскай вобласці, паўночных раёнах Гродзенскай і Мінскай абласцей, ва ўсходніх раёнах Магілёўшчыны, у асобных раёнах Гомельскай і Брэсцкай абласцей. Паводле прагнозаў спецыялістаў, валавы збор збожжа складзе каля 5,5 мільёна тон у бункерай вазе, супраць 7 — у мінулым годзе. У сувязі з засухай цяжкае становішча ў рэспубліцы і з нарыхтоўкай кармоў.

З улікам узнікшай сітуацыі ўрад намеціў рад канкрэтных мер. Органам выканаўчай улады на месцах прапанавана забяспечыць старанны збор і шырокае выкарыстанне саломы на кармы. Каб спаўна забяспечыць насельніцтва хлебам, прынята рашэнне аб выдзяленні сродкаў з бюджэту на закупку неабходнай колькасці збожжа ў Казахстане, з якім ужо ёсць такая дагаворанасць, а таксама ў іншых дзяржавах.

Зменены закупачныя цэны на збожжа. Цяпер базавая цана за адзін кілаграм складзе 10,6 рубля. Вырашана таксама катэгарычна забараніць вываз збожжа з рэспублікі, акрамя таго, каб пазбегнуць далейшага росту цэн, часова забаронены закупкі збожжа на ўнутраным рынку біржамі.

Вострую палеміку на пасяджэнні Прэзідыума Саўміна выклікала абмеркаванне пытання «Аб праекце дзяржаўнай праграмы па ліквідацыі ў рэспубліцы Беларусь вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС на 1993—1995 гады і на перыяд да 2000 года», з дакладам па якому выступіў намеснік старшыні Дзяржкамчарнобыля А. Зубоўскі. Каменем спатыкнення стала праблема адшукання сродкаў на рэалізацыю прапанаваных мер. Толькі на 1993—95 гг. у праграме запланаваны расходы ў суме 40,9 мільярда рублёў. Прэзідыум Саўміна ў асноўным адобрыў праект праграмы. Адначасова вырашана стварыць пагаджальную камісію па канчатковай увязцы найбольш спрэчных момантаў.

На пасяджэнні разгледжаны таксама праект Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, прадстаўлены Міністэрствам юстыцыі. З улікам заўваг праект будзе перададзены на зацвярджэнне сесіі Вярхоўнага Савета.

Прэзідыум Савета Міністраў абмеркаваў таксама пытанні «Аб рэспубліканскай праграме пераходу Беларусі на прынятую ў міжнароднай практыцы сістэму ўліку і статыстыкі» і «Аб стварэнні аўтаматызаваных сістэм безнаяўных разлікаў і штрыхавой ідэнтыфікацыі спажывецкіх тавараў». Прыняты адпаведныя пастановы, у якіх вызначаны канкрэтныя выканаўцы і тэрміны рэалізацыі гэтых праграм — да 1995 года.

Разгледжаны некаторыя іншыя пытанні сацыяльна-эканамічнага жыцця рэспублікі.

Вёў пасяджэнне Прэзідыума першы намеснік Старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь М. Мясніковіч.

Служба інфармацыі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. БЕЛІНФАРМ.

КАЛГАС АХВЯРУЕ НА ХРАМ

КОБРЫН. Прыхаджане Чараўзіцкага прыходу маюць намер аднавіць царкву на месцы спаленай калісьці ў вёсцы Чараваціны. Аднак магчымасці мясцовага насельніцтва сціплыя. Пасля звароту царкоўных служкаў да кіраўнікоў прадпрыемстваў, гаспадароў раёна з просьбай аб дабрачынным дапамозе на рахунак царквы калгас імя Кутузава пералічыў 5 тысяч рублёў, калгас «Новае жыццё» і племзавод «Дружба» — па 3 тысячы.

БелаПАН.

Вялікая карзіна, а запаўняць няма чым

У Санкт-Пецярбургу апублікаваны даныя аб спажывецкай карзіне жыхара горада. Цяпер яе кошт складае 4 тысячы рублёў, пры гэтым сярэдні заработак — каля 2 тысяч.

БелаПАН.

МІХАІЛ МЯСНІКОВІЧ ПРА ЎЛАДУ, НАФТУ, АРМІЮ, ХЛЕБ, НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАРСКІ ФЛОТ, ГАНДАЛЬ ЗБРОЯЙ І ДАСЯГНЕННІ НЕЗАЛЕЖНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ

З першым намеснікам Старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Міхаілам МЯСНІКОВІЧАМ гутарыць карэспандэнт агенцтва «Інтэрфакс» Вячаслаў ЗЯНЬКОВІЧ

— Міхаіл Уладзіміравіч, гэтымі днямі Беларусь святкавала нацыянальнае свята — Дзень незалежнасці. Якія змены за апошнія два гады вы лічыце галоўнымі?

— Наогул па колькасці і значнасці апошніх падзей мінулыя два гады можна параўнаць з цэлым дзесяцігоддзем. Ці ж маглі людзі ўявіць у 1990 годзе, што Беларусь стане праводзіць незалежную самастойную палітыку, што яе дзяржаўнасць прызнаюць больш за 100 краін свету, а больш чым з 50-ю будуць усталяваны дыпламатычныя адносіны? Ці маглі людзі раней уявіць, што можна працаваць без цэнтральных органаў улады ў Маскве? Галоўным набыткам нашай дзяржавы за апошнія два гады лічу змяненне псіхалогіі людзей. Кухары Беларусі эразумелі, што іх радзіма можа існаваць як незалежная дзяржава, што з пераходам на рыначныя адносіны чалавеку найперш трэба разлічваць на ўласныя сілы, а не на дзяржаву. За апошнія два гады ўрад два разы правёў цэнавую рэформу, стварыў якасна іншую сістэму аплаты працы, у корані рэфармаваў размеркавальныя адносіны, даўшы свабоду прадпрыемствам. За гэтыя два гады мы стварылі прынцыпова новую, прызнаную ўсім сусветным супольніцтвам банкаўскую сістэму.

— А ці была гатова рэспубліка да гэтых змен?

— Не ва ўсім. Сапраўды, асабліва першыя месяцы пасля развалу Савецкага Саюза казіралася нейкае «ап'яненне» свабодай. Але ўрад і Вярхоўны Савет не разгубіліся, нягледзячы нават на тое, што на многіх пытаннях, якія раней былі выключна ў кампетэнцыі саюзных структур, у нас не было вопыту вядзення гаспадаркі. Вельмі небяспечна гэта адбівалася на рабоце нашых прамысловых гігантаў — МАЗа, БелАЗа, МТЗ, «Гарызонта» і іншых аб'яднанняў, якія раней падпарадкоўваліся цэнтральным ведамствам у Маскве і мелі сваю спецыфіку работы. Удзельная вага прадпрыемстваў саюзнага падпарадкавання ў Беларусі складала амаль 56 працэнтаў ад усіх рэспубліканскіх вытворчасцей. Каб слынніліся заводы-гіганты, без работы маглі аказацца дзесяткі тысяч чалавек! Хачу адзначыць, што, каб не прадбачлівасць кіраўнікоў прадпрыемстваў, не дапамога ўрада, гэта магло б адбыцца.

Дарэчы, многія праблемы Беларусь ужо ўмела вырашаць самастойна, мінуючы Цэнтр, што ў свой час выклікала негатыўную рэакцыю з боку кіраўніцтва СССР і яго Прэзідэнта М. Гарбачова. Цяпер пра гэта рэдка ўспамінаюць, але ідэя заключэння прамых гаспадарчых дагавораў паміж рэспублікамі СССР належала ў 1990 годзе беларускаму прэм'еру Вячаславу Францавічу Кебічу. Мне даводзілася ў той час бываць у Маскве на пасяджэннях Савета федэрацыі СССР, прэзідэнцкага савета, якія вёў М. Гарбачоў, і памятаю, як той выступаў супраць ініцыятыў кіраўніка нашага ўрада. Толькі ў сярэдзіне 1991 года, усвядоміўшы жыццёвыя рэалі, саюзныя ўлады перасталі чыніць перашкоды ўсталяванню прамых дагавораў па гандлю не фондамі з саюзных рэсурсаў, а канкрэтным таварам. Так што па асобных пазіцыях Беларусь была гатова да сваёй незалежнасці. Разам з тым, у самы бліжэйшы час трэба рэфармаваць сістэму ўлады. У СССР яна трымалася на «трох кітах» — КПСС, Саветах і выканкомах. КПСС больш няма, а сістэма ўлады іншы раз прабуксоўвае. Гэта тлумачыцца недастатковай рэгламентацыяй паўнамоцтваў заканадаўчай і выканаўчай улад. З прыняццем у нас Закона аб мясцовым самакіраванні парушылася звыклая вертыкаль, калі Савет Міністраў мог прымаць рашэнні, абавязковыя для выканання ніжэйстаячымі органамі выканаўчай улады нават у тым выпадку, калі яны ў нейкай ступені супярэчылі рашэнням мясцовых Саветаў. Асабліва гэта датычыцца пытанняў камунальнай уласнасці, сельскай гаспадаркі, экалогіі. Па гэтай самай прычыне ў Беларусі пад пагрозай спынення знаходзіцца, напрыклад, шклянная прамысловасць. Улады Салігорска не жадаюць размяшчаць на сваіх тэрыторыях вытворчасць неабходнай сыравіны для выпуску шкла, матывуючы гэта зусім беспадстаўнымі сцвярджэннямі аб быццам бы экалагічнай шкодлівасці вырабу мінеральнай сыравіны.

— Як вы ставіцеся да ўвядзення ў Беларусі інстытута прэзідэнцкай улады?

— Лічу, што ў нашай рэспубліцы павінен быць прэзідэнт з шырокімі паўнамоцтвамі, як, напрыклад, кіраўнік Белага дома ЗША. Яго аўтарытэт дапамагаў бы вырашаць многія пытанні.

— Эканоміка Беларусі вельмі залежная ад манапалістаў-пастаўшчыкоў з іншых рэспублік былога СССР, у прыватнасці ад Расіі, якая пастаўляе сыравіну, энерганосьбіты. Скажыце, ці можна расцэньваць працоўку пытання аб пастаўках у Беларусь нафты з краін Арабскага Усходу як спробу пазбавіцца ад путаў манапалістаў?

— Калі мы вырашылі стварыць сістэму рыначных адносін, дык у сваіх дзеяннях павінны кіравацца не асноўнымі прынцыпамі. Сёння ўсе разумеюць, што Расіх імкнецца як мага хутчэй пачаць прадаваць нафту ў рэспубліку былога СССР па сусветных цэнах. Рана ці позна гэта можа адбыцца. Нам неабходна пастаянна прапрацоўваць розныя варыянты, прапановы па пастаўках нафты ў Беларусь.

— Міхаіл Уладзіміравіч, наша рэспубліка рыхтуецца абзавесціся ўласным неваенным марскім флотам. Якая доля Беларусі пры раздзеле суднаў былога Савецкага Саюза?

— Дакладных лічбаў пакуль што няма. На маю думку, гэтае пытанне павінна разглядацца перш за ўсё на двухбаковай аснове з Расіяй, а потым і на шматбаковай з іншымі рэспублікамі былога СССР.

— Ці будзе Беларусь гандляваць лішкамі баявой тэхнікі і ўзбраенняў, якіх у нас вельмі многа?

— Так, будзе. Урад разглядае гандаль зброяй выключна, я хацеў бы гэта падкрэсліць, з мэтай выправіць свае эканамічнае становішча. Мы не маем намеру падтрымліваць нейкія рэжымы, не будзем пастаўляць зброю дзяржавам, у якіх парушаюцца правы чалавека, не станем прадаваць яе дзяржавам, дзе могуць узнікнуць узброеныя канфлікты і дзе нестабільная грамадска-палітычная абстаноўка.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

КРАІНА З НЕПРАДКАЗАЛЬНАЙ ГІСТОРЫЯЙ?

«КРАІНА З НЕПРАДКАЗАЛЬНАЙ ГІСТОРЫЯЙ» — гэта знішчальны афарызм пра былы СССР.

Але ж гэтак абражальна могуць сказаць некалі і пра нашу суверэнную Беларусь, калі мы не паклапоцімся, каб новы яе летапіс аб'ектыўна ўлічыў увесь спектр поглядаў на далёкую і блізкую мінуўшчыну, сённяшні дзень рэспублікі.

«Звязда» распачынае цыкл матэрыялаў пад рубрыкай «НАВЕЙШАЯ ГІСТОРЫЯ. УСПАМІНЫ І РОЗДУМ». Мы прадаставім слова як тым, хто некалі фарміраваў і праводзіў афіцыяльную дзяржаўную палітыку, так і тым, хто выступаў у ролі апазіцыі да ўлады, рыхтаваў сённяшнія перамены ў жыцці Беларусі.

Адкрываецца цыкл гутаркай з Міхаілам Зімяніным, адным з лідэраў былых БССР і СССР.

(Матэрыял змешчаны на 3-й старонцы газеты).

ХОЧАМ У СЭЗ. І ХУТЧЭЙ

Пад Брэстам, у калгасе «Пагранічнік», адбылася навукова-практычная канферэнцыя па свабоднай эканамічнай зоне, у якой прынялі ўдзел прадстаўнікі прамысловых прадпрыемстваў і камерцыйных структур Беларусі і іншых дзяржаў.

— Зона ствараецца найперш для прыцягнення замежных інвестыцый, павелічэння рабочых месц, набыцця і прымянення вопыту міжнароднай эканамічнай дзейнасці і, вядома ж, насычэння рынку высакаякаснымі таварамі, — растлумачыў карэспандэнту РІДа старшыня Камітэта па кіраванню СЭЗ Брэста М. Крывецкі, — гэта ніякі не продаж тэрыторыі, а здача ў доўгатэрміновую арэнду. У СЭЗ будуць займацца бізнесам як замежныя, так і беларускія прадпрымальнікі.

Мікалай ЛЯЎЧУК.
(РІД).

ГЕРОІ БАРСЕЛОНЫ-92

Паволі, аднак упэўнена папаўняецца капілка ўзнагарод, заваяваных прадстаўнікамі Рэспублікі Беларусь на Гульнях XXV Алімпіяды ў Барселоне. Нагадаем: пасля першых двух дзён у актыве нашых пасланцаў быў адзін залаты медаль — яго заваяваў стралок з Гродна Канстанцін Лукашык. А вось плыўчыха Алена Рудкоўская з Гомеля і веласіпедыст Ігар Пастуховіч з Мінска да ўзнагарод Барселоны не «дацягнулі» толькі некалькі імгненняў: яны занялі чацвёртыя месцы.

Папаўненне ў капілку зрабілі ўчора адразу два ўдзельнікі Алімпіяды: да залатой узнагароды папярэдніх Гульняў у Сеуле гімнастка Святлана Багінская дадала і «золата» Барселоны. Разам са сваімі сяброўкамі па зборнай СНД Святлана выйграла камандны турнір.

Другую ўзнагароду дэлегацыі Беларусі прынёс мінчанін Сяргей Дземяшкевіч, які выступаў у турнірыі барцоў. Прайграўшы ў першай жа сустрэчы малавядомаму атлету з Кубы Хектару Перэсу, наш чэмпіён свету 1990 года стаў бронзавым прызёрам у вазе да 100 кілаграмаў. Што ж, і «бронза» — таксама ганаровы медаль!

ПАВЕДАМЛЯЕМ ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Экіпаж ваенных лётчыкаў, рызыкуючы жыццём, адвёў бяду ад Гомеля

Ва ўчарашнім нумары газеты было надрукавана паведамленне аб тым, што пад Гомелем пацярпеў катастрофу ваенны самалёт. Сёння мы расказваем, як гэта адбылося.

Пасля водпуску камандзіра эскадрыллі адной з воінскіх лётных часцей, што дыслацыруецца паблізу горада над Сожам, Аляксандра Сцепчанкова экіпаж правяраў яго тэхніку пілатавання. Ён, камандзір экіпажа Віктар Оськін і штурман Мікалай Іваноў павінны былі ажыццявіць кантрольны 25-мінутны палёт па кругу.

Пад умелымі рукамі экіпажа магутны ТУ-22 паслухмяна ірвануў у блакітную бездань, а праз нейкую хвіліну пры скорасці пяцьсот кіламетраў у гадзіну набраў дзевяцісотметровую вышыню. І раптам трывожная сігналізацыя: адмовіў левы рухавік. Віктар зірнуў на яго і ўбачыў тоненькі шлейф дыму і язычкі агню: пажар! На 72-й секундзе палёту на камандна-дыспетчарскі пункт, які кіраваў палётам, паляцела паведамленне аб гэтым. Каманды, што рабіць экіпажу, не паступіла: знікла сувязь паміж бортам паветранага карабля і Зямлёй.

Ды лётчыкі і самі добра ведалі, што рабіць у падобнай сітуацыі. Але вось бяда — выйшаў са строю і другі рухавік. Гэта ўжо вельмі небяспечна, бо стотонны металічны птах з вялікай стрэлавіднасцю крылаў пры малым іх размаху хутка пачне адначасова губляць скорасць і вышыню і непазбежна ўрэжацца ў зямлю. А ўнізе — густанаселены Навабеліцкі раён горада. Там — прадпрыемствы, дзіцячыя садкі, жылыя кварталы. Грымнецца такая махіна — быць вялікай бядзе.

Між тым у інструкцыі запісана: калі ў самалёце падобнага тыпу адмаўляюць два маторы на вышыні менш за чатыры тысячы метраў, экіпаж павінен пакінуць яго. Гэта — аднаэначна. Лётчыкаў у такім выпадку ніхто не папракнуў бы, не асудзіў, бо юрыдычны бок справы быў бы захаваны. Юрыдычны, а чалавечы, маральны бок як? А як быць з уласным сумленнем: унізе — сотні, тысячы людзей.

— Слухаць маю каманду! — перадаў па ўнутранай сувязі Оськін.— Застаёмся на борце, адварочваем ад горада.

У тыя кароткія імгненні часу для разважанняў у экіпажа не было. Пры найвялікшым фізічным і псіхалагічным напружанні ён дзейнічаў. Патрэбен быў вельмі тонкі разлік, каб стварыць самалёту патрэбную траекторыю зніжэння, трымаць пры гэтым пэўную скорасць і адводзіць машыну ўбок. Тым часам ціск у гідрасістэме катастрафічна зніжаўся, і кіраваць машынай, каб яна не пачала падаць, было ўсё цяжэй і цяжэй. І толькі лётчыкі паспелі адвярнуць ад горада, як наперадзе, па курсу, заўважылі нафтасховішча. Да болю сціснуты рукі на штурвалах, апошнія намаганні — і гэтае страшэнна небяспечнае месца здолелі мінуць.

Вось калі ўжо можна падумаць і аб сабе. Хоць думаць і часу ўжо няма. Першым з вышыні ўсяго чатырыста метраў катапультаваўся штурман, які прызямліўся на шашы. Другім — падпалкоўнік Аляксандр Сцепчанкоў — з мінімальнай вышыні катапультавання ў 350 метраў. Яму пашанцавала: парашут раскрыўся ўсяго за некалькі дзесяткаў метраў ад зямлі. Камандзіру экіпажа падпалкоўніку Віктару Оськіну вышыні не хапіла, ён загінуў.

— Загінуў як герой, які ў мірны час здзейсніў вялікі подзвіг,— расказвае камандзір палка Сяргей Разін.— Гэта быў выдатны чалавек, верны таварыш, прафесіянал з вялікай літары.

Падпалкоўнік Віктар Оськін быў узнагароджаны пяцю медалямі, на розных пасадах служыў некалькі гадоў у лётнай часці пад Гомелем, дзе заставалася яго сям'я, а яго самога перавялі ў Расію. Вось-вось ён зноў павінен быў вярнуцца ў Беларусь, куды пастаянна прыязджаў падтрымліваць навыкі палётаў на

(Заканчэнне на 3-й стар.).

НА ЗДЫМКАХ:

▲ Апошні шлях падпалкоўніка Віктара Оськіна. У снежні яму было б сорак.

▲ Члены экіпажа маёр Мікалай Іваноў і падпалкоўнік Аляксандр Сцепчанкоў.

▲ Навабеліцкі раён Гомеля. Яго жыхароў зберагли ад бяды лётчыкі.

Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА. (БЕЛІНФАРМ).

ДЫПЛАМАТЫЧНЫ КУР'ЕР

З НАДЗЕЯЙ НА РАСШЫРЭННЕ КАНТАКТАЎ

Міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь Пётр Краўчанка прыняў Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Італіі ў Беларусі Джана Луку Берцінета. У ходзе сустрэчы, як паведамілі з аддзела інфармацыі МЗС рэспублікі, абмяркоўваліся пытанні двухбаковых адносін, якія маюць узаемную цікавасць. У прыватнасці, размова ішла аб дапамозе, якую Італія мае намер прадаставіць рэспубліцы для вырашэння праблем, звязаных з пакрыццём таварнага дэфіцыту, чакаемым са скарачэннем пагалоўя жывёлы і неўраджаем у сувязі з засухай. Пасол Італіі падкрэсліў, што яго краіна зробіць усё магчымае для павелічэння паставак лімонаў, апельсінаў і аліўкавага алею Беларусі як рэспубліцы, якая найбольш пацярпела ад чарнобыльскай катастрофы.

Пётр Краўчанка па просьбе пасла расказаў аб падпісаных нядаўна пагадненнях паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй, якія датычаць узаемаадносін у палітычнай, эканамічнай і іншых галінах. Была падкрэслена цвёрдая пазіцыя няўдзелу Беларусі ў якіх-небудзь ваенных канфліктах і прыхільнасць рэспублікі да выключна мірных спосабаў вырашэння ўзнікаючых супярэчнасцей.

ЗАКЛЮЧЭННЕ ЭКСПЕРТАЎ — СТАНОЎЧАЕ

Завяршыла сваю работу ў рэспубліцы першая замежная інспекцыйная група па Дагавору аб звычайных узброеных сілах у Еўропе. Як вядома, надзвычайная канферэнцыя дзяржаў — удзельніц дагавора прыняла рашэнне аб яго часовым прымяненні на працягу 120 дзён або да ратыфікацыі ўсімі ўдзельнікамі. Першую інспекцыйную групу ў Беларусь накіравала дзяржава — дэпазітарый дагавора — Каралеўства Нідэрланды. Інспекцыя праводзілася на тэрыторыі Брэсцкай вобласці.

На думку кіраўніка інспекцыйнай групы падпалкоўніка Гаральда Хорста інспекцыя прайшла з ўзаемнай выгадай, заўваг па дзеяннях беларускага боку не было.

БЕЛІНФАРМ.

ПАЛЕМІЧНЫ КЛУБ «ЗВЯЗДЫ»

Камуністычная партыя, страціўшы год назад уладу і маёмасць, не губляе надзеі вярнуць страчанае.

Спрэчкі вакол афіцыяльнай рэгістрацыі Партыі камуністаў Беларусі, масавае адраджэнне партячэек у правінцыі, нешматлікія, але гучныя акцыі пад чырвонымі сцягамі на цэнтральных плошчах сталіцы і ля Музея І з'езда РСДРП — не дамінуючая, але ўсё ж прыкметная з'ява ў палітычным жыцці рэспублікі.

Беларускія камуністы выходзяць з акопаў услед за сваімі маскоўскімі аднадумцамі, якія шумна напомнілі пра сябе спачатку масавымі акцыямі пратэсту ля Астанкінскага тэлецэнтра, а цяпер — працэсам у Канстытуцыйным судзе Расіі вакол правамернасці ўказаў Б. Ельцына аб забароне дзейнасці КПСС.

Чаго дабіваюцца беларускія камуністы! Што будзе азначаць іх магчымы рэванш для народа! У чытачоў «Звязды» наконт гэтага — самыя розныя меркаванні.

Спадары дэмакраты перакладваюць свае памылкі на чужыя плечы

Чарговы выбух антыкамуністычнай істэрыі, які мы назіраем у маскоўскіх сродках масавай інфармацыі, закрануў і нашу рэспубліку. Праўда, тут маштабы не тыя, ды і сілы слабейшыя. З усіх рэплік на гэту тэму, змешчаных у беларускай прэсе, сур'ёзнай увагі заслугоўвае, бадай, толькі ліст да пракурора рэспублікі («Звязда», 20.06.1992 г.). Яго аўтары, народныя дэпутаты Анатоль Вярцінскі і Яўген Цумараў, спрабуюць аспрэчваць рашэнне калегіі Вярхоўнага Суда па факту адмовы ў рэгістрацыі Міністам статута Партыі камуністаў Беларусі. Яны імкнуцца даказаць, што новая партыя нічым не адрозніваецца ад КПБ.

Канешне, кожны чалавек павінен мець магчымасць выказаць свой пункт погляду на любую грамадскую з'яву ці жыццёвы факт. Але абурае тое, што абодва прыхільнікі «стварэння сацыяльна-прававой дзяржавы», якія ў мінулым падтрымлівалі ўсе антыканстытуцыйныя з'явы і акцыі, пачынаючы ад правядзення несанкцыяніраваных мітынгаў да акта вандалізму ля помніка Леніну, сёння выстаўляюць сябе шчырымі змагарамі за канстытуцыйнасць. Дзеля гэтага яны нават дапускаюць, што група грамадзян, якія прытрымліваюцца камуністычных перакананняў, могуць стварыць такую партыю, пакуль міжнародны ці рэспубліканскі суд не забароніць ідэі класавай барацьбы, дыктатуры пралетарыяту. Якая велікадушнасць! Як быццам не ведаюць, што класавую барацьбу нельга забараніць — яна існуе даўно, за тысячагоддзі да Маркса, незалежна ад нашай свядомасці. Што датычыць ідэі дыктатуры пралетарыяту, то яна сёння адсутнічае ў праграмах пераважнай большасці камуністычных партый, у тым ліку — Партыі камуністаў Беларусі. І гэта таксама добра ведаюць аўтары пісьма, але ім, відаць, вельмі хочацца яшчэ раз зрабіць з камуністаў жупел «ворагаў народа».

Як вядома, у жніўні 1991 года Вярхоўны Савет БССР часова прыпыніў дзейнасць КПБ — КПСС на тэрыторыі Беларускай ССР, вырашыў праверыць дачыненне партыйных органаў усіх узроўняў да справы ГКЧП. Пракуратура сумленна выканала свае абавязкі —справа была спынена за адсутнасцю саставу злачынства. Ужо па гэтай простай прычыне забарона КПБ павінна быць знята. Але тут мы амаль на працягу года назіраем палітычныя амбіцыі апазіцыі БНФ, якая, па сутнасці, стала кіруючай сілай у Вярхоўным Савеце.

Шчырым абаронцам канстытуцыйнасці нагадаем тэкст пастановы Вярхоўнага Савета БССР ад 25.08.1991г., за якую апазіцыя БНФ галасавала, як кажуць, абедзвюма рукамі: «Забараніць дзейнасць існуючых структур КПБ, іншых грамадскіх аб'яднанняў (падкрэслена намі. — Аўт.), якія дамагаюцца палітычных мэт, у органах дзяржаўнай улады і кіравання, на прадпрыемствах, ва ўстановах, арганізацыях, размешчаных на тэрыторыі Беларускай ССР». Згодна з пастановай — не толькі КПБ, але і апазіцыя БНФ, і фракцыя БСДГ таксама павінны быць забаронены. Дык чаму гэта пастанова адносіцца толькі да КПБ?

Больш таго, усе заявы ад апазіцыі БНФ, калі ўзяць за аснову дзеючую Канстытуцыю, антыканстытуцыйныя па форме і па сутнасці. Як жа інакш, шаноўныя панове, можна расцэньваць заклікі да адстаўкі законна выбраных Вярхоўнага Савета і ўрада рэспублікі? Чаму гэтыя агрэсіўныя заклікі ў вас не выклікаюць законнага абурэння?

Вярцінскі і Цумараў прызнаюць, што людзі, якія вераць у камуністычную ідэалогію, наогул могуць аб'яднацца ў партыю. Але адмаўляюць у гэтым тым самым людзям на тэрыторыі Беларусі. Вярхоўны Суд з фактамі ў руках пераканаўча даказаў, што сходы па вылучэнню дэлегатаў на ўстаноўчы з'езд партыі нічога агульнага з мінулымі пленумамі і канферэнцыямі райкомаў і гаркомаў не мелі, а праграмныя дакументы ПКБ прынцыпова адрозніваюцца ад афіцыяльных дэкларацый КПБ і КПСС. Дарэчы, уласнага статута КПБ ніколі не мела. І калі стаць на пункт гледжання аўтараў ліста, то атрымаецца, што нават хрысціяне не маюць права стварыць уласную партыю, бо і ў іх відавочная структура ў выглядзе царкоўных прыходаў.

Нашы апаненты ўпарта не хочуць заўважаць, што партыя змяніла не толькі сваю назву. Напрыклад, у кіраўніцтве раённых партыйных арганізацый Мінска няма ніводнага партыйнага функцыянера з былой КПБ. У саставе гаркома амаль трэць — рабочыя. Сярод уступаючых у новую партыю шмат людзей, якія ніколі не былі ні ў КПСС, ні ў БНФ. Яны пераканаліся, што ПКБ—гэта не партыя былой наменклатуры.

Зусім смешна выглядае спроба аўтараў пісьма павучаць, якім павінен быць статут ПКБ. Іх абурае палажэнне статута, якое не забараняе ўдзел членаў ПКБ у дзейнасці іншых грамадскіх аб'яднанняў, у тым ліку— палітычных партый. Між іншым, у мінулым некаторыя члены КПБ уваходзілі ў розныя арганізацыі, напрыклад, у БНФ. І гэта падавалася «плюралістамі» як важнейшы прынцып дэмакратыі.

Аўтары ліста ўгледзелі пагрозу суверэнітэту Беларусі ў рэзалюцыі з'езда, якая падкрэсліла неабходнасць захавання Саюза. Але што тут крамольнага? Як вядома, гэта рашэнне адпавядае волі народа Беларусі і іншых рэспублік, якая была выказана 17 сакавіка 1991 г.

А вось псеўдадэмакраты разам з нацыянал-кар'ерыстамі, на жаль, з гэтай воляй народаў не пажадалі лічыцца. Праўда, сёння камуністам Беларусі трэба моцна падумаць, за які Саюз ім трэба выступаць. Ці патрэбны нам саюз з Ельцыным, Краўчуком, Снегурам? Але гэта ўжо іншая тэма.

Заканамерна ўзнікае пытанне: чаму так напалохаў спадароў сам факт рэгістрацыі ПКБ? Адказ просты. Яны бачаць: ПКБ—моцная сіла, якая будзе аказваць супраціўленне дзікай капіталізацыі, масаваму беспрацоўю, рабаванню большасці грамадзян. Таму робяцца спробы зганьбіць камуністаў, выклікаць у грамадскасці негатыўныя адносіны да іх і на гэтай хвалі працягваць сваю дэструктыўную дзейнасць.

Але, панове, нічога ў вас не атрымаецца, і вам давядзецца несці адказнасць за ўсеагульнае жабрацтва. Дарэчы, разам з учарашнімі партапаратчыкамі, якія перафарбаваліся ў «дэмакратычных» колер і якія ніколі не верылі ў камуністычную ідэю. А тых, хто жыве з верай у яе, не запалохаюць ніякія антыкамуністычныя захады.

Віктар ВОЛЬСКІ,
Уладзімір КАЗЛЯКОЎ,
кандыдаты гістарычных навук, дацэнты.
Яўген СЯМАШКА,
Эдуард ЯСНЫ,
члены Саюза журналістаў Беларусі.

Экалагічная міліцыя створана ў Мазыры пры гарадскім аддзеле ўнутраных спраў. Узначаліў яе Мікалай Бялько, у мінулым старшы ўчастковы інспектар. Двойчы на тыдні разам з прадстаўнікамі гарвыканкома, мясцовай санстанцыі, службаў камунальнай гаспадаркі праводзяцца рэйды па праверцы санітарнага стану горада. У полі зроку экалагічнай міліцыі — і гарадскі парк аўтамабіляў, у прыватнасці, кантроль за захаваннем нормаў выкідаў у атмасферу шкодных газаў.

НА ЗДЫМКУ: старшы інспектар экалагічнай міліцыі Мікалай БЯЛЬКО і грамадскі памочнік Мікалай БАЛАБАЙКА ў час праверкі стану гарадскіх яроў.

Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, (БЕЛІНФАРМ).

«Здань блукае па Беларусі...»

Пад такой назвай у «Звяздзе» за 20 чэрвеня г. г. апублікаваны адкрыты ліст народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь Анатоля Вярцінскага і Яўгена Цумарава да Генеральнага пракурора РБ. У ім аўтары, дарэчы, — члены фракцыі Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады — выказалі свае адносіны да аднаўлення дзейнасці ў Беларусі Камуністычнай партыі.

Рэдакцыя атрымала ліст за подпісам в. а. Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь Уладзіміра КАНДРАЦЬЕВА. Вось што ён піша:

У сувязі з публікацыяй аб незаконнасці рашэння судовай калегіі па грамадзянскіх справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 14.05.92, у адпаведнасці з якім была зарэгістравана Партыя камуністаў Беларусі, пракуратурай Рэспублікі Беларусь выпатрабавана і вывучана грамадзянская справа.

Падстаў для апратэставання гэтай судовай пастановы не знаходжу, выходзячы з наступнага:

У адпаведнасці з п. 16 Часовага палажэння аб парадку ўтварэння і дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў грамадзян у Рэспубліцы Беларусь, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 03.10.90 № 255, у рэгістрацыі грамадскага аб'яднання можа быць адмоўлена ў сувязі з парушэннем устаноўленага парадку стварэння аб'яднання, а таксама з-за неадпаведнасці яго статута патрабаванням Канстытуцыі СССР, Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, іншых заканадаўчых актаў і гэтага Палажэння. Адмаўленне ў рэгістрацыі грамадскага аб'яднання па матывах немэтазгоднасці яго стварэння не дапускаецца.

Згодна з арт. 12 Закона СССР ад 09.10.90 «Аб грамадскіх аб'яднаннях» (дзейнічае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з арт. 3 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб асноўных прынцыпах народаўладдзя ў Рэспубліцы Беларусь» і ў адпаведнасці з пастановай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб агаворцы да Пагаднення аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў» ад 16.01.92) у рэгістрацыі статута грамадскага аб'яднання можа быць адмоўлена, калі статут грамадскага аб'яднання супярэчыць палажэнням артыкулаў: 3 (вызначае мэты стварэння і дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў), 4 (вызначае прынцыпы стварэння і дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў), 10 (рэгулюе змест статута) або раней быў зарэгістраваны статут грамадскага аб'яднання з той жа назвай.

У судовым пасяджэнні ўстаноўлена, што заключэнне начальніка аддзела грамадскіх аб'яднанняў Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад 13.03.92, зацверджаным міністрам юстыцыі, адмоўлена ў рэгістрацыі Статута Партыі камуністаў Беларусі. Падставай для адмаўлення з'явілася тое, што, на думку Міністэрства юстыцыі, партыя камуністаў Беларусі з'яўляецца не новай партыяй, а фактычна КПБ—КПСС з новай назвай, паколькі ў дакументах па падрыхтоўцы ўстаноўчага з'езда партыі і ў дакументах устаноўчага з'езда Партыі камуністаў Беларусі аб'явіла сябе правапераемніцай КПБ—КПСС, заявіла прэтэнзіі на маёмасць апошняй, а таксама ў пратаколах сходаў па вылучэнню дэлегатаў на ўстаноўчы з'езд і ў дакументах з'езда размова ішла не аб стварэнні новай партыі, а аб аднаўленні дзейнасці КПБ, шэраг сходаў праходзіў пад кіраўніцтвам сакратароў партыйных камітэтаў.

У пісьме Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь аб адмаўленні ў рэгістрацыі Партыі камуністаў Беларусі ад 16.03.92 адным з матываў адмаўлення (дадаткова да матываў, якія выкладзены ў заключэнні) з'яўляецца і тое, што ў пратаколах сходаў прадстаўнікоў прыхільнікаў партыі па выбарах дэлегатаў устаноўчага з'езда адсутнічаюць даныя аб паўнамоцтвах гэтых прадстаўнікоў, а ў шэрагу пратаколаў —даныя аб выніках галасавання па выбарах дэлегатаў.

Судовай калегіяй разглядаліся пратаколы сходаў прыхільнікаў стварэння Партыі камуністаў Беларусі, прадстаўленыя Палітвыканкомам партыі Міністэрству юстыцыі, дзе было ўстаноўлена, што ў правядзенні гэтых сходаў прыняло ўдзел звыш 6 тыс. грамадзян рэспублікі, з якіх дэлегатамі на ўстаноўчы з'езд партыі было выбрана 320 чалавек.

Паўнамоцтвы дэлегатаў, якія прыбылі на ўстаноўчы з'езд, правераны і прызнаны сапраўднымі мандатнай камісіяй з'езда. Даклад мандатнай камісіі зацверджаны з'ездам.

Судом не здабыта ніякіх даных, якія даюць падставу сумняваецца, што змешчаныя ў прадстаўленых пратаколах звесткі аб колькасці асоб, якія ўдзельнічаюць у стварэнні партыі, аб правядзенні выбараў дэлегатаў на ўстаноўчы з'езд і аб надзяленні гэтых дэлегатаў паўнамоцтвамі быць заснавальнікамі стварэння партыі. Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь такія даныя суду таксама не прадстаўлены.

Акрамя таго, у рабоце ўстаноўчага з'езда Партыі камуністаў Беларусі прыняло ўдзел 284 прыхільнікі партыі (з іх 281 дэлегат), якія прагаласавалі за стварэнне партыі, яе назву, прынялі Статут партыі і ўтварылі кіруючыя органы.

У адпаведнасці з п. 7 Часовага палажэння аб парадку ўтварэння і дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў грамадзян у Рэспубліцы Беларусь, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 02.10.90 № 255, заснавальнікамі партыі могуць быць грамадзяне Рэспублікі Беларусь у колькасці не менш ста чалавек.

Такім чынам, пры стварэнні Партыі камуністаў Беларусі патрабаванні п. 7 вышэйпаказанага Палажэння парушаны не былі, паколькі і пры правядзенні сходаў заснавальнікаў названай партыі па выбарах дэлегатаў, і на ўстаноўчым з'ездзе партыі пытанне аб стварэнні Партыі камуністаў Беларусі вырашана грамадзянамі Рэспублікі Беларусь у колькасці не менш ста чалавек.

У судовым пасяджэнні даных аб тым, што ўстаноўчым з'ездам заяўлены прэтэнзіі на пераход да Партыі камуністаў Беларусі юрыдычных, у тым ліку і маёмасных правоў, якія належалі КПБ—КПСС, не ўстаноўлена.

Не маюць падстаў да апратэставання судовай пастановы і довады аб тым, што партыя камуністаў Беларусі з'яўляецца КПБ—КПСС, паколькі значная колькасць грамадзян, што прынялі ўдзел у яе стварэнні, не спынілі членства ў КПБ, а значыць не маглі ўдзельнічаць у якасці членаў у дзейнасці другой партыі.

Гэтыя довады таксама праяваліся ў ходзе судовага пасяджэння і былі прызнаны неабгрунтаванымі. Ні Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, ні заканадаўчыя акты, якія рэгулююць парадак утварэння і дзейнасці грамадскіх арганізацый, ні Статут Партыі камуністаў Беларусі, прыняты ўстаноўчым з'ездам, не змяшчаюць забароны на ўдзел грамадзян і іх членства ў дзейнасці некалькіх грамадскіх арганізацый, у тым ліку і палітычных партый.

Матэрыялы ўстаноўчага з'езда Партыі камуністаў Беларусі і Статут, зместкі пратаколаў сходаў прыхільнікаў партыі сведчаць аб тым, што на ўстаноўчым з'ездзе створана новая партыя — Партыя камуністаў Беларусі, а не адноўлена дзейнасць КПБ—КПСС.

Вашу спасылку на тое, што судовая калегія па грамадзянскіх справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь не павінна была разглядаць заяву Палітвыканкома Партыі камуністаў Беларусі, таму што партыя з такой назвай не была зарэгістравана, нельга прызнаць абгрунтаванай.

Заканадаўства аб парадку ўтварэння і дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў грамадзян у Рэспубліцы Беларусь, якое дзейнічае, дае права заснавальнікам грамадскіх аб'яднанняў склікаць устаноўчы з'езд (канферэнцыю) або агульны сход, на якім прымаецца статут (палажэнне) і ўтварэнне кіруючыя органы.

Грамадскія аб'яднанні падлягаюць рэгістрацыі.

Адмаўленне ў рэгістрацыі грамадскага аб'яднання можа быць абскаржана ў месячны тэрмін у суд.

Кіруючым органам Партыі камуністаў Беларусі з'яўляецца Палітвыканком, які ў асобе сваіх прадстаўнікоў Калякіна С. І. і Лашкевіча А. У. у адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства, якое дзейнічае, абскардзіў адмаўленне Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь у рэгістрацыі партыі ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь.

Паколькі заснавальнікамі Партыі камуністаў Беларусі ўстаноўлены парадак для стварэння партыі парушаны не быў, мэты і прынцыпы стварэння і дзейнасці партыі не супярэчаць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і рэспубліканскім законам, змест Статута Партыі камуністаў Беларусі таксама адпавядае Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, заканадаўчым актам і Часоваму палажэнню аб парадку ўтварэння і дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў у Рэспубліцы Беларусь, у цяперашні час статут якой-небудзь другой партыі з такой жа назвай не зарэгістраваны, судовая калегія па грамадзянскіх справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь законна і абгрунтавана пастанавіла прызнаць адмаўленне Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь у рэгістрацыі Партыі камуністаў Беларусі беспадстаўным і абавязаць Міністэрства юстыцыі зарэгістраваць названую палітычную партыю.

Аднойчы падманутыя, мы не купімся на дэмагогію камуністаў

Калі я правільна разумею, дык пастанова вышэйшага органа ўлады рэспублікі аб прыпыненні дзейнасці КПБ—КПСС датычыла не самой камуністычнай ідэі, што мае права на існаванне ў свядомасці людзей, а таго палітычнага монстра, які пранізваў усе поры нашага жыцця: эканоміку, ідэалогію, культуру, прыватнае жыццё асобы, які скалечыў лёсы соцень тысяч людзей.

Час, які мінуў пасля жнівеньскага шоку, патрэбен быў камуністам, каб падвергнуць дэталёваму аналізу амаль 75-гадовую гісторыю ўтрымання ўлады, павярнуцца тварам да рэчаіснасці. Ці было зроблена гэта тымі, хто з энтузіязмам узяўся за адраджэнне партыі камуністаў? Мяркуючы па інтэрв'ю, якое даў газеце В. Чыкін, зроблена гэта было недастаткова прафесіянальна і з надзеяй на тыя ўладныя структуры і тых людзей у іх, якія да нядаўняга часу верай і праўдай служылі былой КПСС—КПБ. Таму і такая пераможная рэляцыя газеце, вера ў будучы поспех. Асабіста ў мяне ёсць шмат сумненняў наконт таго, што ПКБ — іншая партыя, чым была раней. Хутчэй за ўсё тут толькі перастаноўка літар, і не больш.

Той, хто ўважліва сочыць за палітычнымі падзеямі, не можа не назіраць актыўнай барацьбы ПКБ за ўзнаўленне дзейнасці КПСС, а праз яе і тых дзяржаўных структур, якія існавалі да нядаўняга часу. Вось прыклады з маіх назіранняў. РКП падае ў Канстытуцыйны суд заяву аб адмене вядомых указаў Б. Ельцына адносна КПСС, — кіраўнікі ПКБ робяць тое ж, падаючы заяву ў Вярхоўны Суд Беларусі, пад эгідай РКП ствараецца Усерасійскі Славянскі сабор, абліччо якога мы бачылі ля Астанкіна, — ПКБ стварае Усебеларускі сабор з такімі ж мэтамі, прычым час і метады дзейнасці гэтых арганізацый дзіўна супадаюць. Але самае галоўнае, што палохае, — гэта ўпартае жаданне даказаць, што ў тых заганных з'явах, якія мы назіралі ў нашым жыцці, вінавата не сістэма, а канкрэтныя людзі. Не, памыляецеся, паважаныя таварышы Практыка паказвае: непрыняцце плюралізму, таталітарызм — тое асяроддзе, у якім толькі і можа існаваць гэта сістэма, спаўзаючы час ад часу да дыктатуры. І калі В. Чыкін яшчэ замоўчвае гэта, дык у нізавых арганізацыях гавораць больш адкрыта. Вось прыклад. Наваяўлены бізнесмен з Магілёва Б. Кліменка на пытанне карэспандэнта «Магілёўскай праўды» аб яго адносінах да дыктатуры ў інтэрв'ю газеце за 13 чэрвеня г. г. адказвае (цытую даслоўна на мове аўтара).

«Кар.: — Вы не боитесь этого слова?

— А почему я, собственно, должен бояться?.. Насколько я знаю, в Южной Корее, государстве с откровенно диктаторским режимом, сегодня живут богаче и счастливее, чем в некоторых демократических странах».

Патрэбна дадаць, што гэты малады чалавек, 32-х гадоў, выбраны членам гарадскога камітэта ПКБ. Няўжо мы вытравілі з памяці кроў паўднёва-карэйскіх студэнтаў і адсечаныя рукі паэта і музыканта з Чылі Віктара Хара?

Не меншую бяду прынясе нам і жаданне магчымых будучых камуністычных кіраўнікоў дзяржавы Беларусь аднавіць СССР. Ці захочуць мільёны украінцаў, прыбалтыйцаў і іншых народаў, якія цвёрда сталі на шлях незалежнасці, зноў пазбавіцца яе? Дык што, зноў праз кроў да былой імперы? Не, пазбаўце нас такой перспектывы.

Неяк няёмка чытаць заяву В. Чыкіна аб тым, што камуністы Беларусі аказаліся ў палоне маральнага тэрору. Хлусня. Гэта патрэбна для таго, каб зрабіць з сябе новага Хрыста, а ў нас, як вядома, людзі добрыя і з павагай адносяцца да пакутнікаў за Веру. Хутчэй наадварот, таварыш Чыкін. Як толькі аўтар гэтых радкоў падвергнуў дэталёваму аналізу праграмную заяву мясцовых камуністаў, — на наступны дзень тэлефонны званок паабяцаў мне аўтаматную чаргу пры ўмове прыходу камуністаў да ўлады; толькі няштатны карэспандэнт бялыніцкай газеты «Зара над Друццю» А. Пліндоў надрукаваў свае палітычныя эпіграмы, як атрымаў званок з напамінкам, што пры Сталіне за гэта расстрэльвалі.

Калі да гэтага дадаць, што ў цэлым радзе выступленняў нам праводзяць думку, што да 1985 года мы жылі ў грамадстве рэальнага сацыялізму, то ў мяне ёсць прычыны для многіх сумненняў. Дык што ж нам, простым людзям, рабіць, каму верыць?

В. ЦЫРКУНОЎ,
настаўнік Галоўчыцкай СШ.
Бялыніцкі раён.

КАНФЛІКТНАЯ СІТУАЦЫЯ

І зноў рэвалюцыйная неабходнасць?

АБО ЯКІМІ МЕТАДАМІ БУДУЕЦЦА ПРАВАВАЯ ДЗЯРЖАВА

Два гады назад ільнозаводы Гродзеншчыны палічылі неабходным стварыць дзяржаўна-кааператыўнае аб'яднанне «Лён» і выступілі яго заснавальнікамі. Прадпрыемствы «дэлегавалі» гэтай структуры функцыі матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, укаранення новай тэхнікі і тэхналогіі, арганізацыі знешнеэканамічнай дзейнасці, правядзення адзінай цэнавай палітыкі, абучэння кадраў і г. д. Справы пайшлі нядрэнна. Новыя ўмовы гаспадарання і пераход да рынкавых адносін дазволілі заводам аб'яднання ліквідаваць стратнасць і атрымаць летась 18,6 мільёна рублёў прыбытку, а за першы квартал сёлетняга года — 15,6 мільёна.

У саставу аб'яднання, згодна са статутам, былі таксама ўключаны льнасеючыя гаспадаркі вобласці, якія пастаўляюць заводам сыравіну і атрымліваюць адлічэнні ад іх прыбытку. Праўда, іх членства было фармальным, паколькі калгасы і саўгасы не падпісвалі ўстаноўчага дагавора, не пералічвалі сродкаў у статутны фонд аб'яднання і на ўтрымане яго апарату, не ўдзельнічалі ў рабоце савета.

У гэтай сувязі заканамерным будзе пытанне: у чыіх жа руках лёс аб'яднання? У, адпаведнасці са статутам і заканадаўствам ніхто, акрамя заснавальнікаў, а значыць, ільнозаводаў, тут распараджацца права не мае. Аднак здарылася інакш.

18 мая г. г. аблвыканком прымае рашэнне аб немэтазгоднасці існавання аб'яднання «Лён», а 15 чэрвеня старшыня абласнога камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванню М. Гіруць загадвае падпарадкаваць ільнозаводы непасрэдна ведамству, якое ён узначальвае. Матывы быццам бы выкліканы самім жыццём: пашырэнне гаспадарчай самастойнасці прадпрыемстваў, скарачэнне расходаў на кіраўніцкі апарат.

Але вось што здзіўляе. Калі размова ідзе аб самастойнасці прадпрыемстваў і ліквідацыі бюракратычных структур, чаму самі ільнозаводы не праявілі тут ініцыятывы? Няўжо яны менш, чым у аблвыканкоме, зацікаўлены ў скарачэнні расходаў на ўтрыманне апарату і каму, як не ім, заснавальнікам аб'яднання «Лён», паставіць крыж на непатрэбнай надбудове.

Тройчы за апошнія два месяцы кіраўнікі шасці ільнозаводаў вобласці абмяркоўвалі гэту праблему, і свайго пункту гледжання ніхто з іх не змяніў: аб'яднанне трэба захаваць, паколькі паасобку многія пытанні вырашаць будзе значна цяжэй.

Дарэчы, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь Ф. Мірачыцкі таксама не пагадзіўся з такім рашэннем Гродзенскага аблвыканкома і накіраваў туды пісьмо, у якім падкрэсліў, што гэта ўнясе «стыхійнасць у размеркаванне сыравінных зон, выторчасць, перапрацоўку і рэалізацыю льнопрадукцыі, што непазбежна прывядзе да яшчэ большага скарачэння аб'ёмаў продажу льну дзяржаве».

Што датычыць расходу на ўтрыманне апарату аб'яднання «Лён», дык нядаўна заснавальнікі вырашылі скараціць яго колькасць на 50 працэнтаў (да 13 чалавек). Здавалася б, чаго яшчэ трэба? Хто можа перашкодзіць прадпрыемствам, якія без усялякага прымусу, добраахвотна вырашаюць за ўласныя ж (не дзяржаўныя!) сродкі ўтрымліваць неабходную ім структуру?

Аднак кіраўніцтва аблсельгасхарчу працягвае ўпарта гнуць сваю лінію. Замест аб'яднання «Лён» у раёнах мяркуецца стварыць асацыяцыі па вытворчасці, перапрацоўцы і рэалізацыі льновалакна. Відаць, таксама спатрэбіцца кіруючы персанал, да таго ж адпаведную групу з сямі чалавек хочуць мець і пры аблсельгасхарчы. Такім чынам, расходы на ўтрыманне кіраўніцкага апарату наўрад ці скароцяцца.

Але, можа, стварэнне асацыяцый узніме на якасна новы ўзровень арганізацыю льновытворчасці? Адна з іх, у сыравіннай зоне Дворацкага завода, ужо з'явілася. Ці будзе гэта крок наперад — яшчэ невядома, час пакажа. Дык навошта праводзіць рэарганізацыю ўсляпую? Які сэнс разбураць існуючую сістэму, толкам не наладзіўшы новую? Чаму б на прыкладзе таго ж Дворацкага льнозавода не паглядзець, якая сістэма больш эфектыўная? Калі ў асацыяцыі справы пойдуць лепш, можна не сумняваца — ільнозаводы аддадуць перавагу менавіта ім.

Дарэчы, заснавальнікі аб'яднання «Лён» і не лічаць гэту структуру раз і назаўсёды нязменнай. Напрыклад, на адным з апошніх пасяджэнняў яны разглядалі пытанне аб стварэнні на базе льнозаводаў акцыянерных таварыстваў з удзелам пастаўшчыкоў сыравіны.

Здавалася б, не перашкаджайце працоўным калектывам шукаць свой шлях у новых умовах гаспадарання. Аднак кіраўніцтва аблсельгасхарча толькі на словах выступае за пашырэнне самастойнасці прадпрыемстваў. На практыцы ж робіцца адваротнае.

Праўда, метадам сілавога ціску трэба ўсё ж было надаць выгляд законнасці. Але як? Ільнозаводы, як заснавальнікі аб'яднання «Лён», супраць яго ліквідацыі. Тады ў аблсельгасхарчы знайшлі фармальную зачэпку ў статуце аб'яднання, згодна з якім у яго саставу уваходзяць ільнасеючыя калгасы і саўгасы. Прадстаўнікоў гэтых гаспадарак склікаюць у Ліду на сход. Літаральна за некалькі хвілін, без усякага абмеркавання яны (кіраўнікі льнозаводаў, паводле іх слоў, ад галасавання ўстрымаліся) вырашаюць ліквідаваць аб'яднанне «Лён».

Аб правядзенні гэтай акцыі, дарэчы, нават не папярэдзілі в. а. генеральнага дырэктара аб'яднання З. Сітарчук. І яшчэ адно парушэнне: у адпаведнасці з юрыдычнымі нормамі скліканне сходу прадстаўнікоў — прэрагатыва выключна савета аб'яднання. Самае ж галоўнае: насуперак разважнаму сэнсу рашэнне аб ліквідацыі аб'яднання прынялі тыя, хто... не з'яўляецца яго заснавальнікамі, а значыць, не мае на гэта ніякага права.

Але кіраўніцтва аблсельгасхарча, відаць, менш за ўсё хвалявалі пытанні законнасці. Праз некалькі дзён пасля сходу ў Лідзе ствараецца камісія па прыёму і перадачы аблсельгасхарчу маёмасці, абсталявання, інвентару і дакументацыі аб'яднання «Лён» і пачынаецца ціск на яго генеральнага дырэктара з тым, каб ён падпісаў загад аб самаліквідацыі гэтай структуры.

Дык што, зноў рэвалюцыйная неабходнасць, калі мэты апраўдваюць сродкі? Праўда, некаторыя з маіх субяседнікаў лічаць, што гэтыя мэты маюць за ўсё звязаны з удасканаленнем ільновытворчасці, а выкліканы жаданнем вызваліць будынак, у якім сёння размяшчаецца апарат аб'яднання, для іншых структур. Магчыма. справа і не ў гэтым. Аднак у любым выпадку такімі метадамі прававую дзяржаву не пабудуеш.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Паміж намі–суседзямі

У Варшаве падпісаны Дагавор аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніяй Беларусі і Польскім тэлебачаннем. Карэспандэнт БЕЛІНФАРМа папрасіў больш падрабязна расказаць аб выніках візіту кіраўніка беларускай дэлегацыі, міністра інфармацыі рэспублікі Анатоля БУТЭВІЧА.

— Галоўны вынік гэтага візіту — падпісанне першага міжнароднага дакумента, які расшырае межы інфармацыйнай прасторы рэспублікі. Дагавор прадугледжвае абмен публіцыстычна - інфармацыйнымі і мастацкімі тэлепраграмамі ўласнай вытворчасці і стварэнне сумесных творчых работ. Жыхары Беларусі атрымаюць магчымасць убачыць некаторыя перадачы на польскай мове, а нашы суседзі — на беларускай. У гэтых мэтах прадугледжваецца ажыццяўляць абмен творчымі работнікамі — журналістамі і рэжысёрамі.

Мы правялі таксама перагаворы з кіраўніцтвам Польскага агенцтва прэсы (ПАП). Сёння гэта вядомае інфармацыйнае дзяржаўнае агенцтва пастаўляе сваю прадукцыю ў 40 краін свету. Мы дамовіліся з яго дырэктарам Міхалам Чарнецкім аб надрыхтоўцы пагаднення паміж ПАП і Беларускім інфармацыйным агенцтвам. Думаю, такое супрацоўніцтва расшырыць кантакты і дазволіць больш цесна супрацоўнічаць журналісцкім калектывам.

Дэлегацыя сустрэлася таксама з кіраўніком Беластоцкага радыё Ежы Мушынскім. Абодва бакі прыйшлі да думкі, што неабходна абнавіць дзеючы дагавор аб супрацоўніцтве паміж Беларускім і Беластоцкім радыё. У час візіту вывучаліся таксама практычныя магчымасці рэтрансляцыі праграм Беларускага тэлебачання і радыё на пагранічныя раёны Польшчы. Акрамя гэтага, дасягнута папярэдняя згода аб магчымым правядзенні Беластоцкім радыё і прадстаўнікамі Беларусі міжнароднай акцыі пад умоўнай назвай «Выратуем Белавежскую пушчу». Гэта праблема цяпер вывучаецца экспертамі.

Наша дэлегацыя мела многа сустрэч з беларусамі, якія жывуць у Польшчы. Было вельмі прыемна даведацца, што яны беражліва адносяцца да традыцый нацыянальнай культуры. У Гайнуўцы, напрыклад, ствараецца музей беларускай культуры, якому мы дапаможам у стварэнні экспазіцыі. З нашага боку вывучаліся таксама магчымасці, звязаныя з арганізацыяй продажу беларускіх кніг, газет і часопісаў у Польшчы і з дастаўкай польскай прэсы ў Беларусь.

У час паездкі мы перадалі бібліятэчкі беларускіх кніг для супрацоўнікаў кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта і для школьнікаў Беласточчыны.

(БЕЛІНФАРМ).

РОЗГАЛАС

Міхаіл Мясніковіч пра ўладу, нафту, армію, хлеб, нацыянальны марскі флот, гандаль зброяй і дасягненні незалежнай беларускай дзяржавы

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

На сённяшні дзень нічога канкрэтна па пытанню аб продажы зброі не вырашана. Хачу асабліва падкрэсліць, што аб'ектам куплі-продажу ні ў якім разе не стануць сістэмы ядзерных узбраенняў. Яны будуць выводзіцца з тэрыторыі Беларусі і, згодна з наяўнай дамоўленасцю, знішчацца. Продажу ў першую чаргу будуць падлягаць танкі, якіх у рэспубліцы каля трох з палавінай тысяч, што на дзве тысячы больш за норму, вызначаную для Беларусі Венскімі пагадненнямі, а таксама інжынерная тэхніка, баявыя самалёты.

Праводзіць канверсію трэба разумна. Ці варта бяздумна пускаць у пераплаўку добрую баявую тэхніку, ламаць лёсы прафесіяналаў у галіне абаронай прамысловасці, закрываючы ваенныя вытворчасці? Не атрымалася б так, як у перыяд барацьбы з п'янствам у СССР, калі гэтак неашчадна высякаліся лепшыя вінаграднікі.

Выручаныя ад продажу зброі сродкі пойдуць на ўплату знешніх даўгоў Беларусі — за прадастаўленне нам крэдытаў і закуп сацыяльна значных тавараў, напрыклад, лякарстваў. Ваенных заказаў нам робіцца нямала. Думаю, не раскрыю ваеннай ці дзяржаўнай тайны, калі скажу: беларускія спецыялісты цяпер прымаюць удзел у стварэнні сістэмы кіравання паветраным рухам Кубы і Індыі. Гэта датычыцца не толькі ваенных самалётаў. А наогул, лічу армію перажыткам мінулага. Упэўнены, што вельмі хутка чалавецтва адмовіцца ад утрымання ўзброеных сіл.

— Міхаіл Уладзіміравіч, сёлета ў нас небывалая засуха. Ці будзем мы з хлебам?

— Адважуся запэўніць — голад нам не пагражае. Сапраўды, разлікі на ўраджай невысокія. Думаю, збяром прыкладна 6 мільёнаў тон пры патрэбнасці 11—11,5 млн. тон у год. У лепшыя гады збіралі ў сябе 8,5—8,7 мільёна тон, а астатняе закуплялі за нафтадолары, якія паступалі з саюзных фондаў. Добры ўраджай збожжавых чакаецца ў Казахстане. Прэзідэнт гэтай рэспублікі Нурсултан Назарбаеў абяцаў дапамагчы Беларусі. У Алма-Аце цяпер знаходзіцца міністр сельскай гаспадаркі і прадуктаў харчавання Беларусі, міністр хлебапрадуктаў і намеснік міністра абароны, якія дамаўляюцца аб умовах паставак у Беларусь збожжа.

Павінен адзначыць, што ў пытаннях закупкі збожжа ў нас узнікаюць пэўныя цяжкасці. Гэта выклікана няўзгодненай палітыкай, праводзімай рэспублікамі былога СССР у гэтай сферы. Напрыклад, Беларусь устанавіла закупачныя цэны на збожжа ў размеры 7.050 рублёў за тону. А Літва — 13.000, Расія — 10.000, Украіна — 7.900 рублёў. Каму выгадней прадаваць збожжа? Наш урад можа павысіць закупачныя цэны. Але тады цэны на малако, мяса, птушку, хлебабулачныя вырабы адпаведна ўзрастуць. Так, калі мы будзем купляць збожжа па 10.000 рублёў за тону, бохан хлеба ў магазіне будзе каштаваць прыкладна 25 рублёў. Урад сёння не можа гэта дапусціць, паколькі хлеб з'яўляецца ў нас асноўным прадуктам харчавання. Савет Міністраў можа пайсці на датацыю. Але трэба вызначыць, за кошт чаго.

Экіпаж ваенных лётчыкаў, рызыкуючы жыццём, адвёў бяду ад Гомеля

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

самалётах, мадыфікацый якіх там не было. Пад Гомелем для яго была падрыхтавана больш высокая пасада.

Сустрэўся я і са штурманам Мікалаем Івановым, які сябраваў з Віктарам.

— Сітуацыя,— расказаў ён, — заняла ўсяго сто шэсцьдзесят секунд. Гэта — ад узлёту да падзення самалёта. І ў гэтых секундах нібы сканцэнтравалася ўсё жыццё Віктара, якому першага снежня споўнілася б сорак гадоў. Яго я ведаў выдатна, з ім гатоў быў ісці (і не толькі я) у агонь і ваду. Іншага рашэння ад яго ў той крытычнай экстрэмальнай сітуацыі мы і не чакалі. У яго было два выбары — зрабіць у горадзе вялікія разбурэнні і прынесці смерць многім людзям, а самому застацца жыць, ці самому загінуць, не дапусціўшы першага. Нікольскі не вагаючыся, дзейнічаючы асэнсавана, ён прынёс сябе ў ахвяру.

Іваноў праглынуў камяк у горле, працягваў:

— Ці страшна было? Не. Аб страху не было часу думаць. Усё скіравана на аднуадзіную мэту — не нарабіць бяды там, унізе. І мы гэтага дасягнулі. Цаной жыцця любімага камандзіра. Самалёт упаў за горадам — за 90 метраў ад чыгункі і 400 — ад нафтасховішча.

Хавалі Віктара Оськіна ўсім палком, у якім служаць прадстаўнікі дзесяткаў нацыянальнасцей краін СНД. Хавалі рускага хлопца на беларускай зямлі. І ніхто з вайскоўцаў не бачыў у гэтым нешта незвычайнае. Бо ў былым СССР, які хто-ніхто зараз спрабуе паказаць ледзь ці не турмой народаў, яны, гэтыя вайскоўцы, выхоўваліся ў духу інтэрнацыяналізму і патрыятызму, у духу самаадданасці і любві да роднага краю, да сваёй вялікай Айчыны.

З цяжкім сэрцам хадзіў я па могілках, дзе з часу заснавання палка ў сырой зямлі ляжаць ваенныя лётчыкі, якія спрабавалі прадухіліць 14 катастроф. Не ўдалося. Як і Віктар Оськін, яны загінулі маладымі, здаровымі і прыгожымі. Тады і падумалася: што ўтрымлівае іх, кадравых ваенных афіцэраў на гэтай небяспечнай службе? Што ўтрымлівае таго ж Аляксандра Сцепчанкова, які ўжо ў другі раз пабываў у падобнай катастрофе?

Адказ знайшоў у словах камандзіра палка, нашага земляка-мазыраніна Сяргея Разіна і штурмана Мікалая Іванова:

— Любоў да неба. Любоў да прафесіі. Любоў да работы. Любоў да людзей, мірнай працы, якіх мы аберагаем.

І гэтым усё сказана.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

НАВЕЙШАЯ ГІСТОРЫЯ. УСПАМІНЫ І РОЗДУМ

Міхаіл ЗІМЯНІН: «ВЫ ЯШЧЭ ПЕРАКАНАЕЦЕСЯ— Я КАЗАЎ ПРАЎДУ»

— Нядаўна па тэлебачанні дэманстравалася шматсерыйная стужка англійскіх тэлевізійшчыкаў, якая, па-мойму, называлася «Другая руская рэвалюцыя». Там падзеі вясны 85-га года паказваюцца як нейкая гіганцкая бітва процілеглых у ЦК КПСС сіл: рэвалюцыянераў-дэмакратаў на чале з Гарбачовым, Якаўлевым з кансерватарамі на чале з Лігачовым ды некаторымі іншымі. Я ў героях гэтай барацьбы не фігурырую, хоць як сакратар ЦК быў у курсе ўсіх пытанняў. Дык вось, магу вас запэўніць: ніякай такой барацьбы ў той час проста не было і не магло быць.

— А што ж было?

— Было калектыўнае абмеркаванне сітуацыі, выказваліся розныя думкі, але ўсе сыходзіліся ў тым, што ў краіне павінна з'явіцца дружнае, дзейснае кіраўніцтва, здольнае рушыць СССР наперад пасля працяглага застойнага перыяду канца 80-х.

Мы выдатна ўсведамлялі сітуацыю. Калі цяпер усталёўваецца новы ідэалагічны блеф, быццам таварыш Гарбачоў адкрыў новы этап у развіцці партыі, што ён прапанаваў новыя ідэі, што ён з'яўляецца творцам перабудовы, а таварыш Якаўлеў архітэктарам яе разам з таварышам Шэварднадзе і яшчэ сім-тым і г.д., і да т.п., гэта ўсё пустыя сачыненні. Канешне, названыя асобы імкнуліся зрабіць для краіны нешта добрае, але яны ішлі сваёй дарогай, калі дасягненне папулярнасці, задавальненне асабістых амбіцый, прызнанне сваёй ролі як вялікіх рэфарматараў і творцаў незвычайных пераўтварэнняў у жыцці нашай дзяржавы і народа яўна пераважалі.

Яшчэ раз паўтару: выпрацоўка новага курсу партыі ў красавіку 85-га была здзейснена кіраўніцтвам ЦК калектыўна. Гарбачоў выконваў волю ка-лек-тыў-ну-ю, а не персанальную.

Праз шмат гадоў, будучы ў Беларусі, Гарбачоў скажа пра тых людзей даволі стрымана і ў нейкай меры нават іранічна: выйшлі са строю, хто дзе... Ён сам зрабіў усё, каб выставіць сваю фігуру на першы план і вылепіць з сябе творца вялікага павароту. Вось так... Хоць, заўважце, «архітэктара» перабудовы таварыша Якаўлева ў красавіку і паміну не было. Дарэчы, разам з Шэварднадзе яны самыя банальныя разбуральнікі, а не стваральнікі, не рэфарматары. Асабліва Якаўлеў, удакладню дзеля справядлівасці. Вы не абавязаны мне верыць, не абавязаны прытрымлівацца майго ходу думак, не абавязаны згаджацца са мной, але хачу вас запэўніць, што вы яшчэ пераканаецеся: я казаў праўду.

— «Казаў» — гэта неяк самаўхілена?

— Са строю актыўна дзеючых я выйшаў на студзеньскім пленуме 87-га года—вельмі цяжка захварэў і сам папрасіў вызваліць мяне ад абавязкаў сакратара ЦК. Але ў саставе Цэнтральнага Камітэта заставаўся яшчэ два гады, калі напісаў вясной вядомую вам заяву «сотні», у якой мы, ветэраны, знялі з сябе паўнамоцтвы членаў ЦК КПСС.

— Пра гэты эпізод, які атрымаў у свой час самую шырокую вядомасць, ёсць сэнс расказаць больш падрабязна. Ён, памятаю, быў успрыняты адным як крок неардынарны, прынцыповы, аптымістычны, а другімі — як запалоханасць, нават здрадніцтва...

— Канешне, спачатку гэта была задума новага кіраўніцтва. У яе аснове было жаданне пазбавіцца ад вялікай групы людзей, якія аказвалі пэўны стрымальны ўплыў, і аб'ектыўны, і суб'ектыўны, на ўсе надзвычай развітыя маніпуляцыі, ініцыраваныя Гарбачовым—Якаўлевым—Шэварднадзе і кампаніяй. Я з Гарбачовым быў звязаны дастаткова добрымі адносінамі нават у той час. Хоць разумею, наколькі сур'ёзныя памылкі ён робіць, прама ўказваў на яўныя пралікі, нікольні не ўтойваючы сваіх ацэнак тых ці іншых дзеянняў. Але адначасова, не буду хлусіць, добрых адносін да новага лідэра краіны не мяняў. Чаму? Лічыў, што ён пракладвае дарогу наперад, хоць і з памылкамі. Па маёй тагачаснай логіцы, іх трэба было карэкціраваць, але не выступаць супраць Гарбачова асабіста.

А вось цяпер выразна разумею: тая ж ініцыіраваная гарбачоўскім акружэннем заява «сотні» была звычайным жаданнем ліквідаваць стрымальны фактар. Бо ветэраны сталі ўпоперак таго, што трэба назваць патокам імправізацый —Гарбачоў яе вялікі майстар. Але, як правіла, імправізуюць людзі хуткай, але не глыбокай думкі, не глыбокага таленту. У іх нават часу не застаецца на дастатковае асэнсаванне свайго неспадзяванага азарэння: ці то думак, ці то імпульсаў нейкіх, якія іншы раз ідуць не столькі ад свядомасці, колькі ад падсвядомасці—такая асаблівасць імправізацыі. І Гарбачоў, на жаль, аказаўся імправізатарам у горшым сэнсе гэтага слова.

Праўда, не без дапамогі сяброў. Ён вельмі падатлівы, на яго хутка аказвалі ўплыў тыя людзі, пра якіх я нават не магу сказаць, што яны вартыя хоць нейкай павагі і даверу. Вазьміце хоць бы яго акружэнне апошняга часу... Гарбачоў жа за час кіраўніцтва змяніў тры саставы вышэйшага партыйнага штаба, тры саставы! Гэта быў сапраўдны разгон, змена людзей... Хоць, паўтару, гэта мая ацэнка заднім чыслом, нягледзячы на тое, што ўжо тады я разумеў практычна ўсё... Але пераконваў сябе: не трэба станавіцца ўпоперак—маўляў, нашкоджу. Значыць, памыляўся... З другога боку, скажу ў сваё апраўданне, у той час я ўжо сапраўды нічога зрабіць не мог, бо вельмі сур'ёзна хварэў. Хварэў таксама і Грамыка, многія іншыя незадаволеныя і задаволеныя, якія лічылі: калі мы выбраны—дабудзем да канца. Але я прытрымліваўся іншай думкі і пайшоў на падпісанне «заявы ста».

Калі падсумаваць усё сказанае, дык у 85-м Крамлю стала ясна: па-старому жыць нельга. Гарбачоў сфармуляваў гэтую думку не на правах адзінага яе аўтара, а як лідэр Цэнтральнага Камітэта, які менавіта так ацэньваў сітуацыю.

Ва ўсіх нас жыло разуменне: мы павінны хутчэй рухацца па шляху развіцця дэмакратыі. Яна развівалася, але стрымана. Яна скоўвалася межамі, вызначанымі кіраўніцтвам манапольнай партыі—зусім натуральна ў аднапартыйнай сістэме. Ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі з Захадам лічылася: раскрыццё дэмакратычных «граніц» можа прывесці да сур'ёзных ускладненняў. Павінен адзначыць: сігналаў аб трывожным становішчы ў розных рэгіёнах краіны хапала. Гэта насцярожвала, і многія лічылі, што дэмакратыю трэба ўводзіць у пэўным рэжыме, крок за крокам, поўнай свабоды адкрытай дэмакратыі да пары да часу даваць нельга.

Тут была прадуманая палітыка, гэта не проста заціск правоў і свабод, не так званая жалезная заслона ад усяго свету. Не, развіццё ішло, яго неабходнасць, калі ўжо гаварыць па вялікаму рахунку, усведамляў нават Сталін. Так-так! Ён рабіў нейкія крокі, але, канешне, больш уяўныя. Там была падманная тактыка, крывадушнасць, за якой хаваліся тэрор, насілле, укараненне казарменных парадкаў у краіне.

Мы пачалі дастаткова асцярожна: напрыклад, далі магчымасць вылучэння на выбарах альтэрнатыўных кандыдатур. Хоць адначасова пайшлі на манеўр, згадзіўшыся на квоты вылучэння ад розных грамадскіх арганізацый — такім чынам дэпутацкія мандаты фактычна рэзерваваліся. Многія ж баяліся пацярпець паражэнне ва ўмовах жорсткай перадвыбарнай барацьбы, што было на смерць падобна. І пачалася гульня...

— А чым яна скончылася?

— Адзін з'езд фактычна сам сябе разагнаў, цяпер вось другі на чарзе, расійскі. Але, паўтараю, сутнасць справы заключалася ў тым, што новы палітычны курс разам са стаўкай на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага і навукова-тэхнічнага развіцця краіны павінен быў забяспечыць рэжым дэмакратызацыі, свабоды сумлення і іншых правоў чалавека для вываду дзяржавы ў нармальнае, не рэгулюемае антыдэмакратычнымі ўмовамі жыццё. Такім чынам, легенда пра Гарбачова як арганізатара вялікага павароту сапраўды не больш чым легенда. А вось тое, што пачалося пасля красавіка 85-га—ужо асобная размова.

— Міхаіл Васільевіч, вы, як я зразумеў, былі за паступальны, але ніякім чынам не рэвалюцыйны рух наперад, і ў гэтым заключалася прынцыповае адрозненне ад пазіцыі Гарбачова і яго каманды?

— Так. Хачу, аднак, заўважыць: пры ўсім пры тым Гарбачоў быў дастаткова разумны, культурны, адукаваны і ў той час мэтанакіраваны. Тады ён яшчэ так не вагаўся, не манеўраваў, як пачаў гэта рабіць пасля XIX партканферэнцыі, калі ўсё ў яго мазгах, як я зразумеў, перавярнулася пад націскам процілеглых сіл. Няўменне ўжо новых кадраў вышэйшага палітычнага кіраўніцтва забяспечыць планамерныя рамкі пераўтварэнняў эканомікі на новай аснове, калі развал, разгон старой, аўтарытарна-бюракратычнай сістэмы прывёў да зніжэння паказчыкаў вытворчасці, дэзарганізацыі грамадскіх адносін, разам з іншымі негатыўнымі фактарамі парадзіла нарастанне дэзарганізацыі грамадства і падрыў кіруючай ролі партыі. На жаль, Гарбачоў на XIX канферэнцыі даў гэтаму поўны ход пад прыстойнымі прычынамі: маўляў, адкрыты шлях для шырокага развіцця дэмакратыі... Але ж усяму ёсць мера! І аказалася: у тым рэжыме, да якога прыйшла краіна, і ў палітычным, і ў эканамічным, выявіліся велізарныя правалы, узніклі супярэчнасці, нават антаганістычныя, якія, па сутнасці, не павінны мець месца пры сацыялізме, але сталі магчымымі ў выніку недальнабачнай, я сказаў бы неразумнай, а потым і проста паражэнчай палітыкі.

У выніку, калі і Гарбачоў, і Ельцын заявілі пра канец халоднай вайны, пан Буш вельмі слушна заўважыў: перамаглі ў ёй яны, амерыканцы, са сваімі саюзнікамі. Зусім дакладна, без дыпламатыі: перамаглі нашы прынцыпы, перамаглі нашы свабоды... Пасля гэтай аплявухі абодвум крамлёўскім лідэрам Буш паслаў сваю інспектуру па краінах СНД. Усё лагічна... Раней за новага расійскага прэзідэнта і новага расійскага міністра замежных спраў. Гэта ж ганебна!

Але не думайце, што я належу да ліку тых людзей, якія разглядаюць ход цяперашніх падзей, тым больш перспектыву развіцця краіны, толькі ў чорным колеры. Я не стаўлю пад сумненне дэмакратычныя імкненні самога народа, я не стаўлю пад сумненне сумленнасць дэмакратычных імкненняў шматлікіх партый, якія нічога агульнага не маюць з камуністычнай партыяй—яны па-свойму ўсё гэта разумеюць, своесасабліва ўсведамляючы ход падзей, іх спружыны, унутраныя прычыны, заканамернасці, асноўныя фактары развіцця краіны. Гэта іх права так разумець, на тое яна і свабода. Я нікому не збіраюся навязваць тое, як думаю і разважаю сам. Не, я асабіста не лічу, што наша краіна і наш народ пацярпелі паражэнне ў якой бы там ні было вайне і барацьбе, не, наш народ непераможны.

— Прыгавор Буша, на ваш погляд, правільны толькі часткова?

— Пацярпела паражэнне наша палітычнае кіраўніцтва. Так, у выніку яго памылак, пралікаў ворагу ўдалося раз'яднаць славянскія, астатнія народы краіны. Але настане час, і яны злучацца, яны нікуды ад гэтага злучэння не дзенуцца пад пагрозай гібелі вялікага славянскага адгалінавання чалавецтва—я лічу, усё гэта мае сваю ўнутраную логіку развіцця падзей.

І вывад: звароту да старога быць не можа. Ні да аднапартыйнай сістэмы кіраўніцтва грамадствам, ні тым больш да аднапартыйнай сістэмы камуністычнай партыі, таму што калі гэтую камуністычную партыю забараніў яе ж рэнегат, дык ніводнага мітынгу ў яе абарону не адбылося... Гэта ні ў каго не выклікала катэгарычнага асуджэння. Так, канешне, памыляліся, глупствуў нарабілі, і трэцяе, і чацвёртае, і пятае... Але не было такога, як цяпер, не было такой арганізаванай галадухі амаль праз паўстагоддзя пасля заканчэння вайны, на роўным месцы... На мой погляд, у народзе выспявае проціборства вельмі складаных пачуццяў, я гэта адчуваю, калі хаджу, стаю ў чэргах за малаком.

Прымошчванне ў хвост капіталізму, толькі ў хвост—у авангард нас ніхто не выпусціць—будзе такім зняважлівым для краіны і народа, што ён гэтага нікому не дазволіць. Ён прайшоў вялікі шлях, з якога многае павінна быць захавана, умацавана, развіта і прымножана, узбагачана вопытам сусветнага развіцця, арганічна спаяна такім чынам, каб не было рэгрэсіўнага адыходу ў капіталізм, тым больш у дзікі, перыяду першапачатковага накаплення капіталу, як цяпер часта гавораць. Павінен быць выхад на новыя параметры гістарычнага развіцця, сапраўды дэмакратычныя, што адкрываюць перад народам новыя гарызонты.

Краіна зараз развіваецца вельмі супярэчліва. Я, напрыклад, уважліва назіраю за Ельцыным, ведаю яго недахопы і вартасці—чалавек з характарам, з амбіцыямі, як тэарэтык нічога не варты, ён адхрысціўся ад адной ідэалогіі і не прыйшоў да другой. Цяпер заявіў, быццам ён сацыяліст, але вядзе краіну ў капіталізм—дарэчы, не ён вядзе, а сілы, што стаяць за ім, яны разам падштурхоўваюць нас да капіталізму... З гэтай камандай ён ні да чаго добрага Расію не давядзе. Боязна, аднак, што могуць дзяржаву падрасцягнуць. І ўсё ж мне хочацца думаць, што Ельцын, як рускі чалавек, цяпер пачынае ўсведамляць тое, што адбываецца. Я не з'яўляюся яго паклоннікам і прыхільнікам, але быў бы вельмі рад, каб ён апамятаўся і нешта зрабіў для таго, каб гэтая краіна стала на ногі. Але пакуль што, на жаль, справа ідзе да горшага. І чым усё скончыцца —адзін Бог ведае, а Ельцын—не.

Нягледзячы ні на што, я веру ў наш народ.

Аляксандр УЛІЦЕНАК.

Працяг інтэрв'ю ў наступных нумарах.

ВЫСТРАЛ У ЗАЛАТУЮ «ДЗЕСЯТКУ»

ГРОДНА. Калі б яшчэ месяц назад у каго-небудзь спыталіся, хто такі Канстанцін Лукашык, то наўрад ці пачулі дакладны адказ. Справа ў тым, што 17-гадовы навучэнец Гродзенскага вышэйшага электратэхнічнага прафесійнага вучылішча ў вялікім спорце рабіў толькі першыя крокі. У «алімпійскі цягнік» ускочыў у апошні момант, калі нечакана выйграў першынство СНД. Пасля чаго — алімпійская залата Барселоны. А дагэтуль у стралка-пісталетчыка былі толькі перамогі ў юнёрскіх спаборніцтвах. Так, у лютым 1991 года Лукашык прывёз з Англіі залаты медаль еўрапейскай пробы. Праз два месяцы ён заняў ужо першае месца на чэмпіянаце свету ў Нарвегіі. А ў ліпені таго ж года зноў стаў мацнейшым сярод юніёраў у еўрапейскім першынстве па стральбе з пнеўматычнай зброі, якое праходзіла ў Італіі.

Дарэчы, стральбой Косця займаецца толькі чатыры з паловай гады. Як сам прызнаўся, выпадкова з сябрамі аднойчы зазірнуў у дынамаўскі цір, які ад яго дома ўсяго ў 300 метрах. Незнаёмы трэнер даў хлапчуку ў рукі пісталет. Той пастраляў. Спадабалася. Вырашыў прыйсці сюды яшчэ раз. А потым Лукашык запісаўся ў групу да трэнера Алега Уладзіміравіча Пішчукевіча.

І вось цяпер без гэтага ціра не можа Косця ўявіць сваё жыццё. Кожны дзень, калі ён ў Гродна, спяшаецца сюды на трэніроўкі. А яшчэ вучоба, ліцэй. Спецыяльнасць тэхніка - электрыка хлопец выбраў не выпадкова. У свой час тут, яшчэ ў былым прафтэхвучылішчы № 7, займаўся яго бацька Леанід Міхайлавіч, які цяпер працуе электрыкам у прыгарадным калгасе «Іскра». Але ў апошнія месяцы на вучобу ў Лукашыка амаль не застаецца часу — трэніроўкі, зборы, спаборніцтвы. Нават дадому ён з'яўляецца ўсяго на дзень-два. Маці, як звычайна, збярэ яму ў дарогу сумку, пакладзе бутэрброды, чай, электракіпяцільнік.

— Спачатку хвалявалася, што адпускаю аднаго ў далёкую дарогу, — зазначае Яўгенія Іосіфаўна,—але цяпер бачу: самастойны ўжо мой Косця, не па гадах сталы, і за яго я спакойная.

Сапраўды, у няпоўныя 17 гадоў падняцца на вяршыню Алімпа няпроста. Тым больш, у стралковым спорце традыцыйна многа таленавітых пісталетчыкаў, якія, здавалася б, ні за што не ўступяць дарогу маладому спартсмену з перыферыі. Косця Лукашык, аднак, у свае сілы веры ў і зрабіў, на першы погляд, немагчымае. Нават, калі перад апошнім фінальным выстралам у яго задрыжала рука і захістаўся ствол пісталета, ён не разгубіўся: сабраў усю волю ў кулак і выстраліў у «дзесятку». Яна стала сапраўды залатой.

Іосіф ПАПКО.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ

«НЯМЕЦКАЯ ХВАЛЯ»

ФРГ і Літва ўпершыню падпісалі дагавор аб судналодстве.

Урад ФРГ мяркуе прадаставіць мытныя льготы буйнейшым рэспублікам СНД. Такім чынам можна будзе палепшыць канкурэнтаздольнасць Расіі, Украіны, Беларусі і Казахстана.

Спецыялісты лічаць, што ў мэтах бяспекі трэба адключыць 25 з 58 атамных электрастанцый у краінах Усходняй Еўропы. Заходнія краіны ўзмоцняць дапамогу ім, каб выключыць магчымасць новага Чарнобыля.

Ірак пастаянна парушае санкцыі, накладзеныя на яго ААН. Ён зноў прад'яўляе тэрытарыяльныя прэтэнзіі да Кувейта. Хусейн морыць голадам курдскае насельніцтва, нацкоўвае іракцаў на персанал ААН у краіне.

Вельмі незразумелая гульня вядзецца ў апошнія месяцы вакол асобы Хонекера. Скампраметавалі сябе ўсе, бо іх намаганні пастаянна зводзяцца да нуля.

«БІ-БІ-СІ»

Чаму лідэры буйных развітых краін міраца з марудным развіццём эканомікі? Напрыклад, сёлета амерыканская эканоміка наўрад ці выцягне 2,5 працэнта прыросту. Аналітыкі называюць тры галоўныя прычыны. Першая — ваенныя расходы, якія выконвалі ролю матора, значна знізіліся пасля «халоднай вайны», інфраструктуры пабудаваны ўжо. Другая — падзенне нараджальнасці, адсутнасць росту насельніцтва зніжае патрэбнасць у жыллі і асноўных прадметах спажывання. Трэцяя — палітыка ўрадаў, якія на выбарах не жадаюць рызыкаваць сваёй рэпутацыяй, а таму імкнуцца рабіць усё, каб трымаўся высокі ўзровень дабрабыту. З гэтай прычыны палітыкі не хочуць павышаць падаткі, без чаго нельга надаць заходняй эканоміцы сапраўднага імпульсу.

Некалькі вядучых дэпутатаў парламента Расіі рэзка крытыкавалі планы, згодна з якімі Японіі будуць зроблены тэрытарыяльныя ўступкі ў абмен на крэдыты. Яны патрабуюць адмяніць візіт Ельцына ў Японію. Японцы ж паўтараюць, што яны не прадаставяць буйных крэдытаў, пакуль не атрымаюць паўноўных астравоў.

У Афганістане жанчынам забаронена чытаць навіны на дзяржаўным тэлебачанні. Шэраг палітычных партый рашуча выступілі супраць жанчын-дыктараў. Таму ўлады вырашылі лепш адмовіцца ад паслуг жанчын на тэлебачанні, чым рызыкаваць узброенымі сутыкненнямі на гэтай глебе.

Супер-зорка поп-музыкі Майкл Джэксан падаў у суд на англійскую газету «Дэйлі мірар». Ён абдудзецца ў Лондане ў час турнэ зоркі па Еўропе. Газета паведаміла, што ў выніку хірургічных пластычных аперацый твар Джэксана стаў вельмі страшным. Ён нагадвае маску, якая пакрыта шрамамі, нос восьвось праваліцца, адна шчака ніжэйшая за другую, падбародак пачаў адвісаць. Джэксан патрабуе кампенсацыі за маральны ўрон.

РАДЫЁ «СВАБОДА»

Арменія прыняла ўдзел у чарговым этапе рымскай сустрэчы па падрыхтоўцы Мінскай міжнароднай канферэнцыі па Нагорнаму Карабаху. У адноўленых у Рыме перагаворах прымаюць удзел 11 дзяржаў. Перагаворы былі прыпынены ў сувязі з байкотам армянскай дэлегацыі.

ЗША прададуць 34,5 тысячы тон масла Расіі з адтэрміноўкай плацяжу на 3 гады. А таксама бязвыплатна перададуць Літве партыю соевых бабоў на 5 млн. долараў на корм жывёле.

Група афіцэраў СНД прыбыла ў Нарвегію для інспекцыі ваенных аб'ектаў у рамках праграмы скарачэння ўзбраенняў у Еўропе. Будзе праведзена рэвізія колькасці танкаў, знішчальнікаў і артылерыйскіх гармат.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ

ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ І ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА ЎЖО НЕ ЭКЗОТЫКА?

ЖАБІНКА. На сённяшні дзень тут прыватызавана ўжо 425 дамоў і кватэр. У гарадскі бюджэт ад гэтага паступіла дзяржпошліны больш за паўтара мільёна рублёў. Набірае тэмпы ў горадзе і прадпрымальніцтва. На тэрыторыі гарадскога Савета зарэгістравана 79 прадпрымальнікаў. Адметна, што выканком і сам робіць захады па выяўленню людзей, схільных да прадпрымальніцтва, і запрашае іх да гэтай, як слушна мяркуюць «бацькі» горада, карыснай дзейнасці.

БелаПАН.

Я мову б вывучыў толькі за тое...

Упершыню за многа гадоў у Магілёўскім пединстытуце на беларускае аддзяленне філфака колькасць пададзеных абітурыенцкіх заяў большая, чым на заўсёды прэстыжнае рускае аддзяленне.

Напэўна, справа не толькі ў тым, што сюды прымаюцца без уступных экзаменаў — па гутарках. Многія зразумелі, што знатакі беларускай мовы ў недалёкім будучым спатрэбяцца ўсюды, а значыць, хутчэй працаўладкуюцца, што вельмі немаловажна ў наш няскучны час, калі над грамадствам навісае маркотная цень беспрацоўя.

Барыс МІХЕЕЎ.

Ёгаў — на канвеер

ВІЦЕБСК. Ужо больш двух гадоў у клубе ВА «Віцебскдрэў» збіраюцца людзі, якія займаюцца сахаджы-ёгай — сістэмай самаўдасканалення, што дазваляе пазнаць свой унутраны свет і наблізіцца да ісціны. Вучэнне сахаджы-ёгі ўпэўнена крочыць па свеце, рэкрутуючы пад свае сцягі ўсё новых і новых прыхільнікаў гэтай школы. Што датычыцца віцебскага цэнтра, то ў хуткім часе плануецца яго афіцыяльная рэгістрацыя, на якую — прыблізна ў пачатку жніўня — павінен прыехаць Багдан — кіраўнік сахаджы-ёгі ў маштабах былога СССР. Магчыма, пасля прыезду яго расшырыцца і кола захопленых гэтай сістэмай. Пакуль жа колькасць тых, хто пастаянна наведвае заняткі, набліжаецца да 20-ці.

Калі хтосьці думае, што ў фарцоўшчыка лёгкі хлеб, ён памыляецца

ПРА ГЭТА ЯСКРАВА СВЕДЧЫЦЬ ГОРКІ ВОПЫТ МАЛАДОГА ПРАДПРЫМАЛЬНІКА

Існуе тысяча і адзін спосаб здабывання грошай. Калі, канешне, не лічыць працоўных даходаў. У моладзі ўлюбёны — фарцоўка (інакш нельга назваць дзейнасць многіх нашых маладых прадпрымальнікаў, якія купляюць-перапрадаюць). Колькі ж можна зарабляць на фарцоўцы? Мой знаёмы зарабіў на гэтай ніве 450 тысяч у неканверсуемых «драўляных», што, дарэчы, зусім нядрэнна для студэнта дваццаці аднаго года.

Саша далёка не самы багаты з тых, хто здабывае на жыццё на раскошнай ніве спекуляцыі. Некаторыя шчасліўчыкі, па чутках, маюць мільёны. Мой жа знаёмы, за якім я назіраў некаторы час, — звычайны бізнесмен сярэдняй рукі.

Ён жыве разам з бацькамі і малодшым братам, перайшоў на апошні курс тэхнічнай ВНУ, не курыць, п'е ўмерана, часам шмат. Дужае купіць «Жыгулі» — «дзевятку». Добра апрануты, але ўражанне супермена не робіць. У камерцыйных справах праяўляе незвычайную кемлівасць, якая вельмі не падабаецца праваахоўным органам. Захапіўся «купляй-продажам» яшчэ ў школе...

— Я з дзяцінства актыўна збіраў паштоўкі, абменьваў і заўсёды імкнуўся ў абмене быць у выйгрышы. Класе ў шостым да мяне дайшло, што паштоўкі можна выгадна перапрадаваць.

Цяпер, безумоўна, Саша да такой «дробязі» не апускаецца. Чым займаецца?

— Многія чужаземцы прывозяць у Беларусь тавар, які ім няма куды збыць ці не ведаюць, як гэта зрабіць, — тлумачыць ён. — Яны пачынаюць шукаць выхады, а я выступаю ў ролі пасрэдніка, прытрымліваючыся старажытнага прынцыпу: «танней купіць — даражэй прадаць».

Саша працуе ў асноўным у Прыбалтыцы. Амаль кожны тыдзень ён з вялікай сумкай і тоўстым пачкам грошай садзіцца ў вільнюскі поезд, дзе сустракае нямала канкурэнтаў. У сталіцы Літвы ідзе на барахолку. Раней ён браў толькі касметыку і парфуму, цяпер расшырыў сферу бізнесу да «пірамід», пуловераў і скураных куртак. Бярэ столькі, колькі зможа панесці, звычайна на 100—150 тысяч рублёў і накіроўваецца назад.

Бываюць калі-нікалі і «абломы», могуць рэкетнуць у поездзе.

Але пакуль што для Сашы ўсё абыходзілася. Вярнуўшыся да родных пенатаў, ён пачынаў другі этап, а менавіта — рэалізацыю рэчаў. Днём і вечарам прыходзілі да яго моцныя хлопцы, набівалі важкія мяшкі таварам, каб здаць яго ў кааператыўныя магазіны і кіёскі. Уладальнікі магазінаў таксама не першы дзень на свеце жывуць і прынцып «танней купіць — даражэй прадаць» засвоілі моцна. Як вынік — наша аслупянение перад касмічнымі цэнамі на кааператыўных прылаўках.

Але што ж наш Саша?

— А калі хто-небудзь з тваіх хлопцаў не верне грошай?

— Такога ў прынцыпе не бывае. А калі хто не захоча... Яму прыйдзецца аддаваць у два разы больш, у мяне таксама ёсць свае людзі.

Ну, а на што выкарыстоўвае Саша свой прыбытак?

— Адзін мэн паехаў у Штаты, а кватэру пакінуў родзічу. Той пайшоў у туалет, а там усе сцены дзесяткамі абклеены, двайным слоем. Магчыма, таксама гэтым займуся.

Тут Саша крыху скромнічае, сваім даходам ён марыць знайсці лепшае прымяненне. Напрыклад, збіраецца ўзяць камісіёнку ў арэнду. Так што «працэс — гэта жыццё, вынік — гэта смерць» — дэвіз не для яго. Ён жыць любіць, хоць з-за пастаянных падарожжаў стамляецца.

Вельмі магчымы ад'езд яго за мяжу: вось прымуць закон, тады... Камерцыяй можна займацца ўсюды.

ПАСЛЯСЛОЎЕ: некалькі дзён назад Сашу пабілі і абрабавалі ў асабістай кватэры. Бізнес — справа рызыкоўная.

ЗЛОНАЗІРАЛЬНІК.

Віскі... пухавіцкага разліву

МАР'ІНА ГОРКА. Толькі за адзін год на Пухавіцкім заводзе па перапрацоўцы прадукцыі з бульбы пабывалі прадпрымальнікі з Польшчы, В'етнама, Фінляндыі, Югаславіі. У час гэтых візітаў абмяркоўваліся розныя варыянты супрацоўніцтва, было шмат прапаноў. Але сам

РАСЛІНЫ І ЗДАРОЎЕ

ЛОПУХ ВЯЛІКІ

НАРОДНЫЯ НАЗВЫ: брылі, брылёўнік, дзядкі, дзядоўнік, дзяды, задзёрка, рапійнік, сабачнік.

У ГАСПАДАРЦЫ

з лісця лопуху гатуюць настой, якім апырскваюць садовыя дрэвы і кусты ад вусеняў, капуснай бялянкі, молі, соўкі.

Настой лісця лопуху. Палову вядра дробна насечанага лісця заліць даверху вадой, настойваць трое сутак, працадзіць.

Адвар з карэння лопуху ў суадносінах 1:10 абмываюць кароў, коней пры лішаях, свербе скуры, выпадзенні поўсці.

Тлусты алей лопуху выкарыстоўваюць у мылаварэнні, у лакафарбавай прамысловасці, для прыгатавання эліфы.

У ХАРЧАВАННІ

выкарыстоўваюць лісце і карэнне лопуху.

Караняплоды лопуху дасягаюць размеру буйной морквы, могуць замяніць ранняй вясной пятрушку, моркву, пастарнак.

Карэнне ўжываюць толькі ад раслін першага года жыцця — сырым, вараным, смажаным, печаным. Яго кладуць у супы, баршчы замест бульбы, пятрушкі, морквы. З яго гатуюць катлеты, кашы, пюрэ.

З **карэння лопуху** вараць павідла, мармелад, падсмажанае выкарыстоўваюць для прыгатавання кававага напітку.

Муку з высушанага карэння дабаўляюць у цеста для аладак, пернікаў, галет, хлеба.

Маладыя парасткі і лісце выкарыстоўваюць для салатаў, баршчоў.

ЗАКУСКІ З ЛОПУХУ

Салата з лопуху. Маладыя парасткі, чаранкі лісця, лісце прамыць халоднай вадой. Са сцяблоў зняць лупіны, пабланшываць 2 хвіліны, нарэзаць, дабавіць здрабнёную цыбулю, кавалачкі адваранага мяса, накрышанае крутое яйка, пасаліць, заправіць смятанай ці маянэзам, пасыпаць зяленівам кропу і пятрушкі.

150 г лісця і сцяблоў лопуху, 50 г мяса, 1 яйка, 25 г цыбулі зялёнай, 25 г смятаны (ці маянэзу), соль, зяленіва кропу і пятрушкі.

Салата з лопуху зборная. Лісце лопуху, кісліцы, дзьмухаўца, трыпутніку, крапівы, медуніцы, шчаўя змяшаць у роўных колькасцях, пабланшываць 2—3 хвіліны, нарэзаць, дабавіць здрабнёную зялёную цыбулю, пасаліць. Заправіць смятанай, або маянэзам, або алеем.

200 г сумесі раслін, 25 г зялёнай цыбулі, 25—50 г смятаны (або маянэзу, або алею), соль.

ПЕРШЫЯ СТРАВЫ З ЛОПУХУ

Лопухавы боршч. У падсоленым мясным булёне ці вадзе адварыць бульбу, моркву, цыбулю, дабавіць нарэзанае лісце лопуху, шчаўе, праварыць на слабым агні 5 хвілін. Перад падачай на стол у талеркі пакласці скрылёчкі крута зваранага яйка, смятану, пасыпаць зяленівам кропу і пятрушкі.

500 мл булёну, 50 г морквы, 25 г цыбулі рэпчатай, 50 г бульбы, 150 г лісця лопуху, 50 г шчаўю, 1 яйка, 25 г смятаны, соль, зяленіва кропу і пятрушкі.

Квашаная капуста з лопухам па-беларуску. Зварыць квашаную капусту, дабавіць нарэзанае лісце лопуху, заправіць пасераванай на сале цыбуляй, давесці да кіпення. Перад падачай на стол пакласці ў талеркі смятану.

500 мл булёну, 100—150 г капусты квашанай, 150 г лісця лопуху, 20 г сала, 25 г смятаны, 25 г цыбулі рэпчатай, соль.

ДРУГІЯ СТРАВЫ

Пюрэ з лісця лопуху. Маладое лісце лопуху, шчаўе, крапіву (можна толькі лісце лопуху) прамыць халоднай вадой, пабланшаваць 1—3 хвіліны, прапусціць праз мясарубку, пасаліць, дабавіць кроп, перац, добра перамяшаць. Заправіць таматным соусам, або смятанай, або маянэзам, або алеем. Падаць як самастойную страву ці ў якасці гарніру да мяса, рыбы.

Пюрэ можна нарыхтаваць на зіму. Захоўваць у шкляным посудзе ў халаднаватым месцы.

1 кг лісця лопуху, 200 г шчаўю, 200 г крапівы, кропу, перац па смаку, 100—150 г солі (для працяглага захоўвання 200 г).

Каша з лопуху з грыбамі. Здробненае карэнне лопуху і грыбы змяшаць, заліць вадой, пасаліць і згатаваць на слабым агні ў закрытым посудзе. Заправіць маслам ці малаком.

200 г карэння лопуху, 100 г грыбоў, малако, масла, соль па смаку.

Карэнне лопуху печанае. Карэнне добра прамыць у халоднай вадзе, пакласці ў попел на 30 хвілін. Ачысціўшы ад лупінаў, есці гарачым ці халодным з соллю.

У НАРОДНАЙ МЕДЫЦЫНЕ

выкарыстоўваюць лісце, карэнне, насенне. Яны аказваюць мачагоннае, жоўцегоннае, процізапаленчае, антыбактэрыяльнае, раназагойвальнае, процідыябетычнае ўздзеянне. Прэпараты з лопуху нармалізуюць абмен рэчываў, састаў крыві, функцыі страўніка, кішэчніка, узмацняюць рост валасоў, з'яўляюцца прафілактычным і лячэбным сродкам пры каменеўтварэнні, адкладанні соляў.

Настой карэння лопуху. 10—25 г здробненага карэння настойваць у 400 мл кіпеню і гадзіну ў тэрмасе. Піць цёплым па 100 мл 3—4 разы ў дзень пасля яды пры нырках- і жоўцекаменнай хваробе, рэўматызме, падагры, змазваць раны, болькі, бародаўкі, паласкаць горла пры ангіне, мыць і праціраць скуру галавы пры выпадзенні валасоў.

Настой карэння лопуху. 40 г здробненага сушанага карэння настойваць у 300 мл кіпеню ў тэрмасе 2 гадзіны. Працадзіць. Піць па 100 мл 3 разы ў дзень пасля яды пры нырках- і жоўцекаменнай хваробе, цукровым дыябеце, язвавай хваробе страўніка, захворванні прастаты, гастрыце, гемароі, рэўматызме, падагры, экземе, эксудатыўным дыятэзе, фурункулёзе, рахіце.

Настой лісця лопуху. 60 г лісця настойваць у 600 мл кіпеню 4 гадзіны, працадзіць. Піць па 200 мл 3 разы ў дзень пры язвавай хваробе страўніка і дванаццаціперснай кішкі, камянях у нырках, печані.

Настой насення лопуху. 20 г насення настойваць у 200 мл кіпеню, працадзіць. Ужываць па 25—50 мл 3—4 разы ў дзень пры хранічных запорах.

Адвар з карэння лопуху. 15—20 г здробненага карэння гатаваць у 200 мл вады на слабым агні 20 хвілін, настойваць 30 хвілін, працадзіць. Прымаць па 1 сталовай лыжцы 3—4 разы ў дзень пасля яды 20—30 дзён пры нырках- і жоўцекаменнай хваробе, запаленні мачавога пузыра, прастудзе як патагонны сродак, рэўматызме, падагры, астэахандрозе.

Адвар з лопуху і наготкаў. 20 г карэння лопуху, 10 г суквецця наготкаў гатаваць у 1 л вады 10—15 хвілін, працадзіць і астудзіць. Уціраць у скуру галавы ці мыць галаву 2 разы на тыдні пры выпадзенні валасоў.

НАРЫХТОЎВАЮЦЬ

карэнне, лісце, насенне лопуху толькі першага года жыцця. Карэнне другога года вялае, драўнеістае, да ўжывання непрыдатнае.

Выкопваюць карэнне рыдлёўкамі ў верасні — кастрычніку ці вясной, да з'яўлення лісця, атрасаюць ад зямлі, адразаюць надземную частку ля каранёвай шыйкі, усе тонкія карэньчыкі. Буйное карэнне разрэзаюць на кавалкі па 10—15 см даўжынёй, 1—1,5 см шырынёй.

Сушаць у сушылках, духоўках, але не на паветры, дзе можа наступіць працэс браджэння. Пасля сушкі шчотачкай старанна ачышчаюць рэшткі глебы.

Прамытае халоднай вадой карэнне, ачышчанае ад лупінаў, парэзаць на кавалкі і сушыць на паветры, у памяшканнях, якія добра праветрываюцца, дасушваць у сушылках, духоўцы пры тэмпературы 45—50° С.

Высушанае карэнне шаравата-бурага колеру, на зломе бледна-шэрае, са слабым своеасаблівым пахам, саладкаватае, з адчуваннем слізістасці.

Лісце лопуху збіраюць у ліпені—жніўні, сушаць у засені, на скразняку, у памяшканні, якое добра праветрываецца.

Насенне нарыхтоўваюць паэтапна, як паспявае.

Тэрмін прыгоднасці карэнняў 5 гадоў, насення — 3 гады, лісця — 1 год.

Ніна АЛЯКСЕЙЧЫК,
Валер САНЬКО.

ВЫ ПРАСІЛІ РАСКАЗАЦЬ

РЭЛІГІЯ І ДЗЯРЖАВА: новыя адносіны старых знаёмых

Працэсы, якія яшчэ зусім нядаўна мы называлі перабудовачнымі, знайшлі сваё адлюстраванне ў аднаўленні справядлівасці ў адносінах дзяржавы да рэлігіі, царквы і веруючых. Шырокае распаўсюджванне атрымала рэгістрацыя новых рэлігійных абшчын з перадачай ім былых культавых будынкаў.

На пытанні нашага карэспандэнта адказвае старшыня савета па справах рэлігіі пры Мінскім аблвыканкоме М. МЕЛЯШКЕВІЧ.

— Цяпер у нас дзейнічае 191 рэлігійная абшчына, — зазначыў Міхаіл Канстанцінавіч. — У тым ліку 188—зарэгістраваных у адпаведнасці з раней дзеючым заканадаўствам. Такім чынам, у вобласці змяніўся і колькасны састаў абшчын па канфесіях. Гэта: 109 абшчын беларускай праваслаўнай царквы Маскоўскага Патрыярхата, 32 — рымска-каталіцкай, 3 — стараабрадчай царквы, 19 — евангельскіх хрысціян-баптыстаў, 28 — хрысціян веры евангельскай.

Беларуская праваслаўная царква Маскоўскага Патрыярхата — самая значная канфесія як па колькасці рэлігійных абшчын, так і па колькасці веруючых. Амаль дзве трэці веруючых вобласці з'яўляюцца праваслаўнымі. Святкаванне 1000-годдзя хрышчэння Русі ў 1988 годзе стымулявала рост новых рэлігійных абшчын, колькасць здзяйсняемых абрадаў, грашовых даходаў, асабліва за кошт продажу прадметаў культу і рэлігійнай літаратуры.

— А як, так сказаць, з кадрамі царкоўнаслужыцеляў?

— У вобласці 85 свяшчэннікаў абслугоўваюць праваслаўныя прыходы. Іх недастаткова. Для падрыхтоўкі кадраў у рэспубліцы адноўлена з 1988 года дзейнасць Мінскай духоўнай семінарыі, якая размешчана ў манастыры Слонімскага раёна. З верасня 1991 года яна дзейнічае як Вышэйшая духоўная семінарыя. Пры Мінскай епархіі рыхтуюцца кіраўнікі царкоўных хароў.

Другая па колькасці веруючых канфесія — Рымска-каталіцкая царква — 32 прыходы, якія абслугоўваюць толькі 10 ксяндзоў. З іх 4 ксяндзы з Польшчы.

Дзейнасць каталіцкай царквы актывізавалася ў сувязі са знаходжаннем у Беларусі ў 1988 годзе ў якасці госця мітрапаліта Філарэта кіраўніка Польскай каталіцкай царквы кардынала Юзэфа Глемпа. За тры дні ён наведаў Гродна, Ліду, Навагрудак, Мінск, Нясвіж, Пінск, Брэст, дзе адпраўляў імшу, гаварыў пропаведзі, меў гутаркі з духавенствам і прыхаджанамі. Пасля яго візіту ў краіне было адкрыта 6 каталіцкіх епархій, у тым ліку 3 — у нашай рэспубліцы: Гродзенская, Мінска - Магілёўская і Пінская. Дэкрэтам папы рымскага Іаана Паўла II прызначаны епіскапы Кашкевіч і Свёнтак.

Летась у рэспубліку было накіравана 50 ксяндзоў з Польшчы, у тым ліку 4 — у Мінскую вобласць (г. Барысаў, г. п. Івянец Валожынскага, г. п. Мядзель і г. п. Свір Мядзельскага раёнаў). Усе яны заключылі дагаворы з касцёльнымі камітэтамі на падставе часовых умоў, па якіх яны абавязваюцца строга захоўваць законы Рэспублікі Беларусь і традыцыі беларускага народа.

У той жа час актывізавалася місіянерская дзейнасць часткі польскіх ксяндзоў, якія прыязджаюць на прыватных запрашэннях веруючых.

— Ці можна крыху больш падрабязна ахарактарызаваць іншыя абшчыны?

— У вобласці дзейнічаюць тры рэлігійныя абшчыны веруючых — старавераў беспапоўскай згоды — (у г. Барысаве, г. п. Свір Мядзельскага і в. Масціўча Валожынскага раёнаў). Акрамя таго, яшчэ ёсць 19 абшчын евангельскіх хрысціян - баптыстаў і 28 — хрысціян веры евангельскай (пяцідзесятнікаў). Іх абслугоўваюць 55 прасвітараў.

За апошнія 5 гадоў у вобласці зарэгістравана 90 новых рэлігійных абшчын. Іх рэгістрацыя выклікае адабрэнне ў веруючых і садзейнічае таму, што на Міншчыне ва ўсіх раёнах і гарадах дзейнічаюць зарэгістраваныя рэлігійныя абшчыны розных канфесій з той толькі розніцай, што ў адных іх больш, а ў другіх — менш. Больш за ўсё абшчын у Вілейскім раёне — 26, Валожынскім — 18, Мядзельскім — 17, Нясвіжскім і Салігорскім — па 16, Маладзечанскім — 14.

— А ёсць дзе веруючым адпраўляць свае абрады?

— Выканкомамі мясцовых Саветаў вяртаюцца веруючым былыя культавыя будынкі. Толькі за апошнія чатыры гады веруючым вернуты 44 праваслаўныя царквы, 15 касцёлаў і 1 стараверская царква.

У вобласці вядуцца работы па аднаўленню цэркваў і касцёлаў за грошы веруючых. На сённяшні дзень ужо адноўлена і асвечана 46 такіх культавых будынкаў, у якіх рэгулярна праводзяцца богаслужэнні.

Паводле нашых падлікаў, у 1992 годзе ў вобласці будзе створана 50 новых рэлігійных абшчын.

Гутарыў
Міхась ЗАБАШЭВІЧ.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

30 ліпеня

Беларускае тэлебачанне

16.30. Навіны.
16.35. «Хаджа Насрэддзін», «Дзівосны манеж», «Добрая казка». Мультфільмы.
17.20. Яўрэйскія народныя песні выконвае хор СШ № 102 г. Мінска.
18.00. Чаму пусцеюць даёнкі. Аб пашавым утрыманні жывёлы ў гаспадарках вобласці. Перадача з Віцебска.
18.20. «Маці чалавечая». Дак. фільм.
18.55. Зачытайце маё пісьмо...
19.00. Абласныя навіны (Гродна).
19.10. Гаспадар.
19.55. Трэці тайм.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Латарэя ўдачы.
21.30. Студыя «Сэнс» у Браслаўскім раёне.
23.00. НІКа.
23.15. Іграе Раберта Турын (Італія).

І канал. Астанкіна

11.25. На XXV летніх Алімпійскіх гульнях.
12.55. З. Кочыш іграе Ф. Шапэна.
13.10. Талемікст.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. XXV летнія Алімпійскія гульні.
15.55. «У пошуках капітана Гранта». 3-я серыя.
17.00. Навіны.
17.25. ...Да 16 і старэйшым.
17.55. «Багатыя таксама плачуць».
18.40. Дзённік XXV летніх Алімпійскіх гульняў.
18.50. «Сакрэтныя службы» (Францыя). 3-я серыя «Краты, дыверсанты, забойцы і іншыя».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. XXV летнія Алімпійскія гульні. У перапынку (23.00) — Навіны.
1.00. «Начны візіт». Маст. фільм. 1-я серыя.

Канал «Расія»

12.55. Спорт-шоу.
13.00. Весткі.
13.20. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
15.00. Тармінал.
15.30. Мінарэт.
15.45. Пілігрым.
16.30. Там-там навіны.
16.45. Т.Ін.Ка.
17.00. «Каўказ-рэвю».
17.45. Парламенцкі веснік.
18.00. Студыя «Нотабене».
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.20. XXV летнія Алімпійскія гульні. Бокс. Плаванне. Спартыўная гімнастыка (жанчыны).
22.00. Весткі.
22.20. Спорт-шоу.
22.25. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
22.55. XXV летнія Алімпійскія гульні. Дзюдо. Спартыўная гімнастыка (жанчыны).

31 ліпеня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Дайце мне спяваць». Фільм-канцэрт.
9.35. «Антон Іванавіч злуе». Маст. фільм.
16.30. Навіны.
16.35. Мультфільмы.
17.25. «Канікулы, канікулы...» Адпачынак дзяцей у піянерскім лагеры «Чабарок».
18.00. Праблемы лясной гаспадаркі. Перадача з Брэста.
18.45. Дак. фільм «Аўтапартрэт з кветкамі».
19.00. Абласныя навіны (Магілёў).
19.10. Наш каментарый. «Гандаль — не вытворчасць».
19.15. Бізнес-клуб «Партнёр» прапануе...
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. «Антон Іванавіч злуе». Маст. фільм.
22.40. НІКа.
22.55. Забаўляльная праграма.

І канал. Астанкіна

8.00. Навіны.
8.20. «Багатыя таксама плачуць».
9.05. «Фермер-92». Міжнародны фестываль кантры- і фолк-музыкі.
10.00. XXV летнія Алімпійскія гульні.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.25. На XXV летніх Алімпійскіх гульнях.
12.55. «Ноч нараджэння». Мультфільм.
13.15. Брыдж.
13.40. Бізнес-клас.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. XXV летнія Алімпійскія гульні.
15.55. «У пошуках капітана Гранта». 4-я серыя.
17.00. Навіны.
17.25. Чалавек і закон.
17.55. «Прыгоды чорнага Прыгажуна» (Англія). 3-я серыя.
18.20. ТВ—«Нява». «Хто з нас?»
18.40. Дзённік XXV летніх Алімпійскіх гульняў.
18.50. «Поле цудаў».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. XXV летнія Алімпійскія гульні. У перапынку (23.00) — Навіны.
1.45. «Начны візіт». Маст. фільм. 2-я серыя.

Канал «Расія»

9.55. XXV летнія Алімпійскія гульні. Валейбол (мужчыны). Баскетбол (мужчыны).
12.55. Спорт-шоу.
13.00. Весткі.
13.20. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
15.00. Тэлебіржа.
15.30. Рок чыстай вады.
15.50. Пісьмы з Ялты.
16.30. Там-там навіны.
16.45. Т.Ін.Ка.
17.00. «Адлюстраванне».
17.45. Панове-таварышы.
18.00. Белая варона.
18.45. Крымінальныя паведамленні.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. XXV летнія Алімпійскія гульні. Веласпорт. Плаванне.
20.00. Хрона. У свеце аўта- і мотаспорту.
20.30. XXV летнія Алімпійскія гульні. Веласпорт. Лёгкая атлетыка.
22.00. Весткі.
22.20. Спорт-шоу.
22.25. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
22.55. XXV летнія Алімпійскія гульні. Дзюдо. Бокс.

НА ДВОР'Е

30 ліпеня

Сёння ўдзень па рэспубліцы пераменная воблачнасць пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ў Віцебску, Магілёве — 21—23, Гродна і Мінску — 22—24, Гомелі — 23—25, Брэсце — 24—26 градусаў цепла. У наступныя двое сутак: 31-га пераважна без ападкаў, 1 жніўня месцамі пройдуць дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы 12—17, удзень — 22—27 градусаў цепла.

Л. САНКЕВІЧ,
інжынер-сіноптык.

АРТЫКУЛ 19 у пасведчаннях удзельніка ліквідацыі аварыі на ЧАЭС, выдадзеных Міндарбудам Рэспублікі Беларусь на імя:

1. Сініца Д. Н. А № 577784

2. Гнаценка Н. С. А № 577786

3. Васілец В. М. А № 577788

А. Навашынскі М. І. А № 577790 ЛІЧЫЦЬ НЕСАПРАЎДНЫМ.

ЗАГАДКАВАЕ. НЕВЕРАГОДНАЕ. ФАНТАСТЫЧНАЕ

ЛЯТАЮЦЬ НЕ ТОЛЬКІ БОГІ

Ці можа чалавек лятаць, як птушка? Дзевяноста дзевяць са ста апытаных, напэўна, адкажуць адмоўна: сіла гравітацыі прыцягвае да Зямлі, а крылаў у чалавека няма. Некаторыя дададуць, што свабодныя палёты бываюць толькі ў сне, ды і то ў дзяцінстве, калі чалавек расце. І памыляцца. Ён не лятае, таму што не хоча.

Пры ўсёй парадаксальнасці гэтага сцвярджэння мінулы попыт чалавецтва сведчыць аб яго правамернасці. Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова ўспомніць аб левітацыі. Савецкі энцыклапедычны слоўнік наогул выключае гэта паняцце, як ілжэнавуковае. «Брытанская энцыклапедыя» дае яму такое вызначэнне: «Левітацыя — пад'ём цела ў паветра без прымянення механізмаў». Яна прыводзіць і санскрыцкае тлумачэнне левітацыі: «Звышнатуральная здольнасць станавіцца лёгкім па жаданню».

Але чаму «звышнатуральная»? Калі звярнуцца да гісторыі, то ў ёй можна знайсці нямала прыкладаў левітацыі, яна ўспрымалася людзьмі як зусім нармальная, хоць і дастаткова рэдкая з'ява. Іншая справа, што валодалі ёю людзі выключна па сваіх духоўных якасцях. У Індыі, напрыклад, да іх ліку адносіліся многія жрацы-брахманы, ёгі і святыя самотнікі. У індыйскіх Ведах (у літаральным перакладзе з санскрыту «веда» азначае «веды») змяшчаецца нават практычны дапаможнік па левітацыі. Шкада толькі, што за мінулыя стагоддзі значнае многіх старажытнаіндыйскіх слоў аказалася страчаным, так што ў перакладзе на сучасную мову гэта інструкцыя не працуе.

У эпоху Асвячэння (яе змяніла эпоха страты ведаў, а затым настала цяперашняя эпоха знявагі) патаемныя веды былі даступнымі не толькі вялікім Брамчары — настаўнікам, але і простым людзям. Ва ўсякім разе легенды сцвярджаюць, што левітацыяй карысталіся... зладзеі, якія кралі скарбніцы раджаў. Каштоўнасці ў іх ахоўвалі кобры. Праслізнуць міма такіх пільных вартаўнікоў чалавек не мог. А вось для «лятаючага» ўзломшчыка яны не ўяўлялі ніякай небяспекі.

Між іншым, левітацыя была вядомая не толькі на Усходзе. Узяць хоць бы Ісуса Хрыста, які хадзіў па вадзе, што было магчыма толькі ў тым выпадку, калі ён мог зменшыць сваю вагу, гэта значыць, пераадолець гравітацыю. У «Філасофіі магічнага» яе аўтар Сальверце піша: «Захопленыя вучні Ямблініуса (памёр у 333 годзе нашай эры) сцвярджалі, што калі ён выкладаў, то ўзносіўся на вышыню 12 локцяў над зямлёй». А пра ведзьмаў наогул няма чаго гаварыць. Іх можна лічыць сапраўднымі асамі. Калі ж звярнуцца да больш праўдзівых фактаў, то нельга не ўпамянуць святога Іосіфа Купярцінскага. Пасля прыняцця яго ў Францысканскі ордэн, як сведчаць летапісы, «ён часта падымаўся і заставаўся вісець у паветры. Паколькі такія з'явы, калі яны адбываліся публічна, выклікалі хваляванні і саромілі абшчыну, то Іосіфу на працягу 35 гадоў не дазвалялі наведваць клірас, і для яго была выдзелена асобная капліца».

Ды і ў больш блізкія нам часы выяўляецца вялікая колькасць засведчаных відавочцамі выпадкаў левітацыі. Звычайна людзі падымаліся параўнаўча невысока — ад 10 да 50 сантыметраў, радзей — да паўтара метра. У выключных выпадках —ад 2 да 3 метраў, хоць зарэгістраваны і рэкорд, роўны 50 метрам! Працягласць «палётаў» таксама была розная. Часцей яна не перавышала некалькіх секунд, і толькі асабліва адораныя левітанты ляталі дзесяткі хвілін, а максімальная працягласць складала тры гадзіны. І вось што цікава. Колькі б чалавек ні знаходзіўся ў паветры, яго не зносіла ветрам, і ён прызямляўся ў тым жа месцы, адкуль узлятаў. Канешне, калі «лятун» не ставіў сабе на мэце перамяшчэнне адносна геаграфічных каардынатаў.

Самым праслаўленым левітантам мінулага стагоддзя быў вядомы англійскі экстрасенс Даніэль Дуглас Юм. Ён двойчы прыязджаў у Расію, прычым у 1872 годзе даў некалькі сеансаў у прысутнасці прафесараў Пецярбургскага універсітэта Бутлерава і Вагнера. Відавочцы зафіксавалі сама меней сто выпадкаў яго пад'ёму ў паветра. А 16 снежня 1868 года Юм, які, відаць, знаходзіўся ў трансе, выйшаў з аднаго акна, уляцеў у другое на адлегласці сямі футаў і на вышыні 70 футаў над зямлёй.

Верагоднасць феномена Юма пацвярджае вядомы англійскі фізік, член Каралеўскага навуковага таварыства В. Крукс, блізка знаёмы з выдатным медыумам: «Аднойчы Юм адышоў у бок ад усіх, хто знаходзіўся ў пакоі. Прастаяўшы нерухома з хвіліну, ён сказаў, што падымаецца ў паветра. Я бачыў, як ён павольна і плаўна падняўся і павіс на адлегласці прыкладна шасці дзюймаў ад падлогі і праз некалькі секунд ціха апусціўся. Ніхто з прысутных не рухаўся з месца. Другі раз папрасіў мяне падысці да яго, калі ён знаходзіўся на вышыні васемнаццаці дзюймаў ад падлогі. Я правёў рукой вакол яго, пад яго нагамі і над яго галавой, пакуль ён вісеў у паветры. Некалькі разоў Юм падымаўся разам з крэслам, на якім сядзеў. Звычайна ўсё гэта адбывалася вельмі спакойна. Іншы раз Юм падбіраў ногі пад сядзенне крэсла і падымаў рукі так, каб мы іх бачылі. Аднойчы я сагнуўся і пераканаўся, што ўсе чатыры ножкі крэсла знаходзіліся адначасова ў паветры, а ногі Юма былі на крэсле. Радзей, і ўсё ж здаралася, што і сядзеўшыя побач з ім падымаліся ў паветра. Адзін раз такім чынам была паднята мая жонка разам з крэслам».

У нашы дні на Захадзе сапраўдную сенсацыю выклікалі палёты доктара Дэмак Чопры. Прычым у друку былі апублікаваны фатаграфіі, на якіх доктар Чопра адлюстраваны лятаючым у паветры разам з сямю тысячамі сваіх вучняў!

Меркаванні аб прыродзе левітацыі вельмі супярэчлівыя. Да нядаўняга часу тыя, хто меркаваў, што яна магчымая, тлумачылі яе ўменнем змяншаць уласную вагу амаль да нуля. «Са школьных гадоў мы памятаем: «На цела, апушчанае ў вадкасць або газ, дзейнічае выштурхоўваючая сіла, роўная вазе вадкасці або газу ў аб'ёме цела». Так-так, не сумнявайцеся, гэта закон Архімеда. Дык вось, мы жывём на дне паветранага акіяна. У гэтых умовах, скажам, цела чалавека вагой 50 кілаграмаў (якое адпавядае аб'ёму 50 літраў) выцясняе такую ж колькасць паветра, якое важыць 65 грамаў. Уявім сабе, што вага цела змяншаецца, імкнецца да нуля. Пакуль яна будзе больш за 65 грамаў, цела застанецца на дне паветранага акіяна, апіраючыся на паверхню Зямлі. Але як толькі вага цела стане меншай, з'явіцца пад'ёмная сіла, роўная розніцы вагі, і цела пачне «ўсплываць». Аднак шчыльнасць паветра падае з вышынёй. Менавіта таму цела завісне на той вышыні, дзе вага паветра ў аб'ёме цела роўная новаму значэнню яго вагі... Элементарныя разлікі паказваюць, што на вышыні 1 метра цела завісне ў выпадку, калі пад'ёмная сіла, якая дзейнічае на яго на ўзроўні зямлі, будзе роўная ўсяго васьмі міліграмам!» — лічыць Ю. Росціус.

Даную гіпотэзу можна было б лічыць прымальнай, калі б палёты левітантаў зводзіліся толькі да пад'ёму ў паветра па вертыкалі. Але пры левітацыі ў асобных выпадках адбываецца і гарызантальнае перамяшчэнне лятаючага чалавека, якога яна, на жаль, не растлумачвае. Прычым такія палёты зусім не пустыя выдумкі, а дакладна зафіксаваныя факты.

...У нашы дні шырокае распаўсюджванне атрымала філасофска-рэлігійнае вучэнне Бхагават-Гіту, або Навука Творчага Розуму. Яго краеугольны камень — трансцэндэнтальная свядомасць, якая не абмежаваная якімі-небудзь рамкамі і можа атрымаць інфармацыю прама з навакольнага свету і ад сусветнага розуму, а не толькі з дапамогай органаў пачуццяў. Каб дабіцца гэтага, трэба адключыць свядомасць, і тады чалавек пачынае ўспрымаць вялікі паток інфармацыі, што паступае ў падсвядомасць.

Сусветна вядомым прапаведнікам гэтага вучэння стаў Махарыша Махеш Йогі, фізік па адукацыі, выпускнік Алахабадскага універсітэта, які на працягу многіх гадоў спасцігаў у індыйскіх настаўнікаў-гуру спадчыну старажытных ведаў, а затым інтэрпрэціраваў іх у святле сучаснай навукі. Перабраўшыся ў ЗША, ён праславіўся тым, што ў 1957 годзе аб'явіў аб наступленні эпохі прасвятлення і пачаў прапаведаваць сваю праграму трансцэндэнтальнай медытацыі. Яе мэта — удасканаленне чалавека шляхам разняволення свядомасці, далучэння да Навукі Творчага Розуму і тым самым раскрыцця ўсіх патэнцыяльных магчымасцей яго арганізма. Да іх ліку адносіцца, у прыватнасці, і левітацыя. Здольнасць да яе закладзена ў кожным, трэба толькі навучыць карыстацца ёю, сцвярджае Махарыша Махеш Йогі.

У 1971 годзе новы месія заснаваў у штаце Айова свой універсітэт. Потым былі створаны Еўрапейскі даследчы універсітэт у Швейцарыі, яго сабраты ў ФРГ, Англіі, Індыі, а таксама цэлы шэраг навукова-даследчых цэнтраў. У іх былі запрошаны вядомыя спецыялісты розных профіляў — фізікі, знаўцы індыйскай філасофіі, матэматыкі, урачы, інжынеры, псіхолагі, якія паставілі перад сабой мэту зрабіць чалавека шчаслівым. А адной з прыкладных задач стала навучыць яго лятаць з дапамогай трансцэндэнтальнай медытацыі.

У ліпені 1986 года ў Вашынгтоне былі праведзены першыя спаборніцтвы падрыхтаваных імі левітантаў, аб якіх шмат пісала прэса і былі зняты фільмы. У праграму спаборніцтваў уваходзілі палёты ў вышыню на далёкасць і скорасць. Хоць паказаныя ўдзельнікамі вынікі непараўнальныя з дайшоўшымі да нас апісаннямі выпадкаў левітацыі ў мінулым, іх безумоўна можна лічыць фенаменальнымі: 60 сантыметраў у вышыню і 1,8 метра ў даўжыню! Праўда, назваць іх палётамі ў строгім сэнсе слова нельга. Хутчэй гэта палёты з абмежаванымі магчымасцямі, але знешне яны выглядаюць проста фантастычна. Уявіце чалавека, які нерухома сядзіць у позе «лотаса» са скрыжаванымі нагамі і раптам плаўна падымаецца ў паветра! Вучоны лічаць, што гэта толькі пачатак, за ім рана ці позна абавязкова будзе свабодны палёт.

Ці апраўданы такі прагноз? Думаецца, што так. Сёння псіхакінез стаў навукова прызнаным фактам. Яго сутнасць заключаецца ў тым, што шляхам намаганняў ў думках аператар-экстрасенс генерыруе нейкую энергію, якая ўздзейнічае на аб'ект, пераадольваючы сілу гравітацыі. Але і левітацыю ў прынцыпе можна разглядаць як такі ж працэс з той толькі розніцай, што аб'ектам з'яўляецца сам аператар. У фізічным сэнсе гэта праявы аднаго і таго ж феномена. Адсюль вывад, што па меры росту колькасных характарыстык выпраменьвання будуць павялічвацца і параметры левітацыі.

Да гэтага застаецца толькі дадаць, што вядомы экстрасенс Юрый Лонга мае намер прайсці па вадзе, «які па суху», а яго калега Валерый Лаўрыненка ўжо сёлета збіраецца падняцца ў паветра, можа быць, нават на вышыню чалавечага росту. «Калі амерыканцы лятаюць, то чаму б і нам не палятаць?» — кажа ён.

«Деловой мир».

НАВІНЫ АКЦЫЯНЕРНАГА ТАВАРЫСТВА «БЕЛАГРАПРАМБІРЖА»

БЕЛАГРАПРАМБІРЖА МЕНСК

На таргах у пятніцу, 24 ліпеня 1992 года, было прапанавана на продаж больш як 2 тысячы відаў тавараў на суму звыш 1 мільярда рублёў.

Сярод прададзеных і купленых тавараў:

Назва тавару	Адзінка вымярэння	Цана за адзінку (рублёў)
Збожжасумесь фуражная	тона	10.500
Соевы шрот (ЗША)	тона	11.000
Трактар МТЗ-80	шт.	260.000-270.000
Аўтамабіль Масквіч-4121	шт.	410.000
Плёнка поліэтыленавая	кг.	120
Дошка неабразная хвойных парод	м. куб.	2.500
Засаўка 3766Р, д=150	шт.	1.800
Пад'ёмнік аўтамабільны ПА-1192 (перакульвальнік)	шт.	860
Шкло 3 мм. заводскі асартымент	м. кв.	93
Рыдлёўкі саўковыя	шт.	60
Ксеракс FC-2	шт.	125.000
Вугалок, 63	тона	22.000

Праўленне АТ «Белагрупрамбіржа» інфармуе, што ў адпаведнасці з распараджэннем Савета Міністраў РБ, № 574 р ад 4 чэрвеня 1992 года, прадпрыемствам і арганізацыям Мінсельгасхарча дазволена ажыццяўляць рэалізацыю вырабленых імі харчовых тавараў ці набытых матэрыяльных каштоўнасцей спажыўцам у іншых рэспубліках, якія раней уваходзілі ў СССР, у абмен на камплектуючыя вырабы, паўфабрыкаты, сыравіну і матэрыялы пры незабяспечанасці імі вытворчасці ці неабходнасці замены аднаго віду матэрыялу на іншы.

Вываз прадукцыі і тавараў за межы рэспублікі ажыццяўляецца па дазволу